№ 43 (353) 21 лістапада 2003 www.nn.by

# Наша Ніва

ПЕРШАЯ БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЭТА

Заснаваная ў 1906. Аднаўленая ў 1991. Выходзіць у пятніцы




**Генадзь Аляшчук**
Асоба тыдня.
старонка 16

**Няроўная доля**
«Народнае Волі».
старонка 4

**Алег Латышонак**
У нас будзе касьмічны флёт.
старонка 14

**Сьпевы акына і малюнкі на пяску**
Новае ў Сьпісе сусьветнай спадчыны.
старонка 12

# Вяртаньне Стражава

**Казулін і Стражаў сутыкнуліся калісь падчас прызначэньня Стражава міністрам адукацыі. У той час на гэтую пасаду прэтэндаваў і Казулін.**
**Былы міністар адукацыі, а цяпер рэктар БДУ В.Стражаў пасьля сваёй адстаўкі ў 2001 г. працяглы час знаходзіўся на стажыроўцы ў ЗША і Нямеччыне — спасьцігаў заходні досьвед арганізацыі вышэйшай адукацыі. Гэтая інфармацыя набывае новае адценьне на фоне пашыраных чутак пра сувязі Казуліна ў Расеі і МДУ ў прыватнасьці.**
**У сваім выступе падчас прадстаўленьня Навуковай радзе БДУ Стражаў заклікаў «знайсьці адказ на пытаньні агульнаэўрапейскай інтэграцыі», адмовіўшыся ад савецкіх падыходаў да адукацыйнага працэсу і адпаведна зьмяніўшы зьмест і форму гэтага працэсу. «Мы павінны перайсьці ад той савецкай сыстэмы, дзе студэнта вучылі, да сыстэмы, прынятай ва ўсім сьвеце, калі студэнт вучыцца сам», — заявіў новы рэктар. Рада прыняла да ведама зьмену рэктара і ягоную праграму, не задаўшы прадстаўнікам улады ніводнага пытаньня.** На фота: Васіль Стражаў, новы рэктар БДУ, на інаўгурацыйным паседжаньні Навуковай рады ўнівэрсытэту.



PHOTO BYMEDIA.NET

# Казуліна зарэтушавалі

Адстаўка рэктара БДУ Аляксандра Казуліна чакалася даўно, але здарылася неспадзявана. Ён ня быў палітыкам, але лічыўся пасьпяховым чалавекам сыстэмы. Ён ня быў бізнэсоўцам, але ператварыў БДУ ў буйную бізнэс-карпарацыю. І гэта давала некаторым падставы называць яго пераемнікам Лукашэнкі. Сёньня Казулін скінуты з уладавай шахматнай дошкі і дазваляе нечуваныя для лукашэнкаўца дзёрзкасьці на адрас уладаў. Працэс Казуліна азначае пачатак новага палітычнага цыклу ў краіне.

Чуткі пра хуткую адстаўку Казуліна пайшлі пасьля прэзыдэнцкіх выбараў 2001 г. Зьявілася вэрсія, што рэктар трапіў у няміласьць, бо не забясьпечыў «правільных» вынікаў галасаваньня студэнтаў. Аднак гэтая вэрсія магла нарадзіцца ў сьценах БДУ, а прычыны адстаўкі трэба шукаць у іншым.

Хмары над Казуліным пачалі зьбірацца летась. Трывожным сыгналам сталася пазбаўленьне БДУ незалежнасьці ад Міністэрства адукацыі, а Казуліна — статусу міністра. А ў сьнежні 2002-га Лукашэнка публічна адхіліў ягоную кандыдатуру на пасаду пастаяннага прадстаўніка Беларусі ў ААН.

Прычым кандыдатуру рэктара зацьвердзілі ў МЗС, і ўмяшаньне ў справу кіраўніка дзяржавы было нечаканасьцю для ведамства, якое ў той час узначальваў міністар Хвастоў.

**Працяг на старонцы 3.**

# Беларускія «500 дзён» расьцягнуцца

## «Круглы стол» у Рэдакцыі «НН»

Абсалютная большасьць беларусаў жадае, каб краіна далучылася да Эўразьвязу. Меркаваньне, што «нас там ніхто не чакае», справядлівае толькі на дзьве трацыні: нас ніхто ня будзе чакаць, пакуль мы самі не заявім пра сваё жаданьне і пакуль мы не прывядзём свайго заканадаўства, гаспадаркі і палітычнай сыстэмы ў адпаведнасьць з «эўрастандартамі». Ні клікаць, ні гнаць Беларусь дубцом у рай ніхто ня будзе. Але і геаграфічнай прыналежнасьці да Эўропы ніхто ў нас не адбярэ. Варта захацець, і краіна можа пастукацца ў тыя ж дзьверы, перад якімі стаяць Польшча ці Баўгарыя. Толькі трэба, каб краіна адпавядала мінімальным патрабаваньням Эўразьвязу да краінаў-кандыдатак, аднолькавым для ўсіх. Як падрыхтавацца Беларусь да ўступленьня ў Эўразьвяз? Што для гэтага мусяць рабіць тыя ці іншыя дзяржаўныя структуры, што — грамадзянская супольнасьць?

Адказы на гэтыя пытаньні фармулявалі 23 беларускія навукоўцы ў рамках гадавога праекту «Эўрапейскі выбар для Беларусі», вынікам якога стаў том «Беларусь: сцэнары рэформаў», што выйшаў з друку па-беларуску і па-расейску два тыдні таму (ангельскае выданьне чакаецца ў сьнежні). Распрацаваны групай праект рэформаў стаў тэмаю «круглага стала» ў Рэдакцыі «НН».

Сцэнар пераўтварэньняў, выпрацаваны калектывам з 23 беларускіх навукоўцаў і палітолягаў, розьніцца ад ранейшых праграмаў лібэралізацыі тым, што ён распрацаваны не «пад дэмакратычны», а пад любы праэўрапейскі ўрад без увагі на ступень яго дэмакратычнасьці ці палітычныя перакананьні. Праца ўражвае сваім маштабам — у ёй былі задзейнічаныя чатыры навуковыя рэдактары зь Літвы, Польшчы, Украіны, восем замежных экспэртаў зь пяці краінаў.

**Працяг на старонцы 6.**

### Юрыстаў прывязваюць да пасадаў

**Пастанова Саўміну «Аб ліцэнзаваньні некаторых відаў дзейнасьці» пазбаўляе звольненых супрацоўнікаў праваахоўных органаў,** а таксама адвакатаў і натарыюсаў, што працавалі ў дзяржаўных канторах, права ўладкавацца ў недзяржаўны сэктар на працягу пяці гадоў. Іх прыраўнавалі да недзеяздольных асоб і злачынцаў.

### Разгаданая загадка Кіклёпаў

**Кіклёп Паліфэм насамрэч быў карлікавым слонікам.** Чарапы гэтых жывёлінаў з адтулінай для хобату, якая нагадвае вока ў сярэдзіне лоба, археолягі знайшлі на Сыцыліі й іншых міжземнаморскіх выспах. Шкілеты зьніклых істотаў экспануюцца на выставе «Паліфэм у Модэне». Слонікі былі памерам з добрага мядзьведзя і вымерлі незадоўга да стварэньня грэцкіх эпасаў. Іх косткі старажытныя грэкі лічылі парэшткамі кіклёпаў.

### Польшча—Беларусь 0:4.

Футбалісты моладзевае зборнае Беларусі ў сераду разграмілі сваіх аднагодкаў з Польшчы на іх полі зь лікам 4:0. Яны дабіліся выхаду ў фінал чэмпіянату Эўропы.



PHOTO.BYMEDIA.NET

# Змова, але ня тая

**Камэнтар да «паксасгейту» літоўскага тыднёвіка «Veidas».**

Прэзыдэнт Літвы Раландас Паксас па зьяўленьні першых абвінавачаньняў на адрас сваіх дарадцаў заявіў, што гэта «змова». Не прайшло і двух тыдняў ад пачатку скандалу, а Паксас пра тыя словы ўжо нат ня згадвае.

Аднак дакумэнты, знойдзеныя пракуратурай у доме Юр'я Барысава, найбуйнейшага прэзыдэнтавага спонсара, спрычыніліся да вяртаньня тэмы «змовы». Толькі цяпер гаворка ідзе аб змове сапраўднай. Грамадзкасьць даведалася пра плян «Страказа», мэтай якога была перадача ўсёй улады ў краіне лібэральным дэмакратам і асабіста Паксасу. Інакш як змовай гэты плян нельга назваць. Змовай супраць дэмакратыі, змовай супраць дзяржавы. Тое, што плян не ўдалося ажыцьцявіць, перш за ўсё посьпех Літвы і спэцслужбаў яе саюзьнікаў. Змоўшчыкаў выдаў іх спосаб мысьленьня, якога яны не маглі і, пэўна, ніколі ня змогуць зьмяніць. Гледзячы з вышыні сваіх пасад на літоўцаў-«недачалавекаў», яны былі ня ў стане паверыць, што гэтая краіна, зь іх пункту гледжаньня ня вартая нават таго, каб называцца дзяржавай, можа проціпаставіць нешта вялікім аналітыкам з КГБ. Што ў Літве могуць дзейнічаць прафэсійныя службы бясьпекі, якія карыстаюцца павагай калег з-за акіяну. Што ў Літве за 14 гадоў незалежнасьці, нягледзячы ні на што, узьнікла грамадзянская супольнасьць. Што ў Літве ня ўсё і ня ўсіх можна купіць. Што Літва, нягледзячы ні на што, зрабілася эўрапейскай дзяржавай.

**Аўдрус Бачуліс**

Новае ў «паксасгейце» — старонка 5.

## Завучваюць прамову Лукашэнкі



У БДУ працуе комплексная праверка з Камітэту дзяржкантролю. На катэдры рыторыкі і мэтодыкі на філялягічным факультэце праверка выявіла «недапушчальны пралік» — адсутнасьць прамоваў кіраўніка дзяржавы. «Як можна выкладаць рыторыку, не абапіраючыся на прамовы прэзыдэнта, не цытуючы іх?» — абурыліся праверальнікі. Цяпер на катэдры зьявілася выданьне лекцыі «Гістарычны выбар Беларусі», зь якой А.Лукашэнка выступаў у БДУ. Кніга стаіць у шафе на пачэсным месцы. А выкладчыкі завучваюць гістарычную прамову.

**АШ**

## Прэзэнтацыя «Слоўніка «НН»



У Цэнтральнай навуковай бібліятэцы Акадэміі навук адбылася прэзэнтацыя першага тому «Слоўніка мовы «Нашай Нівы». Праца над выданьнем, як кажа ўкладальніца Валянціна Лемцюгова, пачалася ў 80-я, калі стваралася картатэка і расьпісваліся тэксты «НН». У 1990 г. пачалася сыстэматызацыя матэрыялаў, а першы том выйшаў толькі ў 2003-м.

Госьці імпрэзы — архівіст Віталь Скалабан, літаратуразнаўца Міхась Мушынскі, дасьледчык літаратуры Ўладзімер Конан — найбольш чакаюць пятага тому, у якім мусяць быць паказальнікі геаграфіі распаўсюджваньня «Нашай Нівы», аўтараў і артыкулаў. Наступныя тамы маюць выйсьці таксама ў выдавецтве «Тэхналёгія», якое якраз адсьвяткавала сваё 15-годзьдзе.

**Сяргей Трафілаў**

# У палітыцы і каля палітыкі

**Выявіла сябе дэпутацкая група палаты прадстаўнікоў «Спрыяньне эканамічнаму разьвіцьцю» (СЭР).** 18 лістапада яна прэзэнтавала альтэрнатыўны праект закону «Аб зацьвярджэньні асноўных кірункаў унутранай і замежнай палітыкі Рэспублікі Беларусі» (такі закон штогод прапануе ўрад). Галоўнае адрозьненьне ў замежнапалітычнай сфэры — **«сэры» прапануюць замацаваць прыярытэт стратэгічнага партнэрства нашай краіны з Расеяй, што на гэты раз адсутнічала ў праекце ўраду**. Група «СЭР» яднае прамыслоўцаў і прадпрымальнікаў, кіруе ёй 36-гадовы юрыст зь Менску Кірыл Халопік.

Беларускае партыйнае жыцьцё, нягледзячы на сваю кволасьць, рэгулярна стварае інфармацыйныя нагоды. Дэпутат палаты прадстаўнікоў **Уладзімер Навасяд абвесьціў пра стварэньне новай партыі — лібэральнай.** Гэта напэўна заблытае апазыцыйны лібэральны электарат, адбярэ на выбарах галасы ў кандыдатаў АГП. Устаноўчы зьезд мае адбыцца ў суботу.

Тым часам **Мінюст адмовіў у рэгістрацыі Беларускай дэмакратычнай партыі**, заснаванай яшчэ ў пачатку лета. Падставы — дробныя памылкі ў дакумэнтах. А яшчэ дэмакратаў (дакладней — дэмакратак) абвінавацілі ў «парушэньні балянсу»: у праграме гаворыцца, што партыя заснаваная жанчынамі, а ў сьпісе заснавальнікаў Мінюст налічыў 286 мужчынаў... Цяпер кіраўніцтва незарэгістраванай БДП вырашае, ці падаваць скаргу ў Вярхоўны Суд або дзейнічаць далей нелегальна. «Можа, пойдзем да «пяцёркі», калі яна нас прыме», — сказала партыйная кіраўнічка Валянціна Палевікова. Тым часам **зьезд БСДГ, што мусіў адбыцца 23 лістапада, зноў перанесены**. Станіслаў Шушкевіч, зь якім удалося пагаварыць напярэдадні яго адлёту ў ЗША, куды яго запрасілі чытаць лекцыі, запэўніваў, што ён да гэтага ня мае дачыненьня, а прычына ў нейкіх «напаўтэхнічных праблемах».

**«Пракалоўся» КДБ, які спрабаваў завэрбаваць старшыню Менскай абласной Рады Партыі БНФ**, дэпутата Пухавіцкага райсавету Алеся Міхалевіча. Партыйны функцыянэр, які і падчас першай такой спробы ў 1993 г., адмовіўся. Інфармацыя пра здарэньне пайшла ў незалежныя СМІ, але можна чакаць, что дзяржбясьпека будзе ўсё адмаўляць.

Чым бліжэйшая зіма, тым больш нэрвуюцца беларускія чыноўнікі. Аляксандар Лукашэнка патрабуе ад іх забясьпечыць цяпло ў кватэрах грамадзянаў і падкрэсьлівае, што праблема гэтая палітычная. Калі людзі будуць мерзнуць, стабільнасьць у краіне не гарантаваная. Але, нягледзячы на страх перад магчымасьцю сацыяльнага выбуху, улады працягваюць падвышаць цэны на паслугі жыльлёва-камунальнай гаспадаркі. Бо ня вераць у народны супраціў. Апазыцыя ж, захапіўшыся пашырэньнем кааліцыяў, пакуль ніяк не рыхтуецца **да пачатку сьнежня, калі ў паштовых скрынях беларусаў зьявяцца першыя «жыроўкі» з астранамічнымі лічбамі**.

**Алег Тачоны**

ЛЕВЫМ ВОКАМ

# Прынада для турыстаў



Беларусь у сьвеце ведаюць па прэзыдэнту і забойцу прэзыдэнта.

**У дні, калі ўсе, быццам дамовіўшыся, мусоляць гадавіну забойства Кенэдзі, нельга абысьці ўвагай асобу кілера — Лі Харлі Освальда і яго вялізнае культурна-палітычнае значэньне для Беларусі.**

У свой час будучага снайпэра пераклініла абмяняць свой арлісты пашпарт з надпісам «In God we trust» на сярпаста-малаткасты з дэвізам «Пролетарии всех стран, соединяйтесь!» і менскай прапіскай.

Асоба Освальда ўвайшла ў сонм славутасьцяў нашай Бацькаўшчыны поруч з буслом, «Песьнярамі» і старадароскім першаком. У будучым турыстычныя кантора проста прырэчаны эксплюатаваць факт, што забіваць Кенэдзі Освальд выправіўся з аэрапорту «Менск-1». Гэта наш абсалютны эксклюзіў. Які турыст адмовіцца сфоткацца на памяць каля музэю BAB, дзе, паводле словаў гіда, невядомы беларускі партызан навучыў Освальда снайпэрскаму рамяству. Або набыць сувэнірную t-shirt з слоганам: «Лі Харві Освальд. Сусьветны тур забойцы: Менск, 1960 г. — Далас, 1963 г.». Тут няма нічога благога: Чыкага эксплюатуе вобраз сталіцы гангстэраў, Сан-Францыска вабіць турыстаў засьценкамі Алькатрасу, Лёндан — васковым статуём Джэка Вантробніка. Бізнэс ёсьць бізнэс.

Яшчэ больш цікавы палітычны аспэкт фэномэну Освальда. Ён несьвядома ўклініўся ў айчынную традыцыю радыкальнага супраціву, закладзеную «кінжальшчыкамі» Каліноўскага і працягнутую бамбістамі Грыневіцкім і Пуліхавым, местачковымі габрэямі-тэрарыстамі, партызанамі Прытыцкім і Мазанік («Беларускага вызвольнага войска», якое прыпісала сабе Глеба Самойлава і кучу катастрофаў эндагеннага характару, я ня ўлічваю).

Патрапіўшы ў такую лігу выдатных джэнтэльмэнаў, Освальд з забойцы-псыхапата ператвараецца ў сымпатычнага палітідэаліста, якому проста не падфарціла. І адразу робіцца прывабным аб'ектам для палітычнага піяру. Яшчэ ў 1997 г. маладафронтаўцы ўдала выкарыстоўвалі вобраз Освальда, арганізаваўшы турнір па стральбе на прыз яго імя.

Учынак Освальда тлумачылі кантактамі з КГБ, з ФБР, з мафіяй, зь Фідэлем Кастра, з антыкастрыстамі, лятэнтным каханьнем да Мэрылін Манро... У будучым трэба абавязкова чакаць беларускіх інтэрпрэтацыяў піфпафу ў Даласе.

Вэрсія A. «Рука Бога» (для панславістаў). Лі Харві, тусуючыся ў Менску, прыняў праваслаўе. Неяк падчас посту яму зьявіўся сам арханёл Міхал з інструкцыяй: «Раб божы Лі Харлі, ступай у Амэрыку і пакарай каталіка Кенэдзі». Захопленыя пэрспэктывамі вяртаваньня хрысьціянскай айкумэны, Освальд выканаў місію.

Версія B. «Рука нацыі» (для нацдэмаў). У Менску Освальд скантачыўся зь беларускім нацыянальным падпольлем — групай «Чорны кот — Белая котка». Пад нікам «Ясь з-пад Пітсбургу» Освальд удзельнічаў у зьнішчэньні кукурузных пасеваў у пік хрушчоўскай кампаніі кукурузізацыі. Вярнуўшыся ў ЗША, Освальд прымае грамадзянства БНР. Калі Кенэдзі зарэкамэндаваў сябе мяккацелым прэзыдэнтам, гатовым на саступкі імпэрыі зла, Освальд вырашыў адпомсьціць ворагам нацыі.

Вэрсія C. «Рука клясы» (для левых). Працоўнаму калектыву «Гарызонту» набрыдзела адлічваць частку заробку ў фонд дапамогі Антыімпэрыялістычнаму фронту вызваленьня Экватарыяльнага Бутану імя Рабіната Тагора. Каб пакончыць зь несправядлівасьцю, гарызонцкая прафпрэвічка вырашыла эліміневаць саму крыніцу імпэрыялізму — зьнішчыць прэзыдэнта ЗША. Освальд бліскуча выканаў загад працоўных.

Як бы ні скончылася спрэчка за сымбалічную спадчыну Освальда, відавочна адно: сёньня сымбалямі Беларусі ў сьвеце зьяўляюцца прэзыдэнт і забойца прэзыдэнта. Вось такая ў нас вонкавая самарэпрэзэнтацыя.

**Лёлік Ушкін**

ПРАВЫМ ВОКАМ

# Наш Хадаркоўскі – Казулін

**На што ні кінеш вокам — ужо было. Прэзыдэнт Кучма спрабуе накласьці інтэрдыкт на Вярхоўную Раду — ці памятаеце Маскву 1993-га? Прэзыдэнта Паксаса намагаюцца вывесьці на чыстую ваду — у якім годзе таго ж Кучму выкрываў нехта Мельнічэнка? Прэзыдэнта Шэварднадзэ турбуюць — глядзі Беларусь, спроба імпічмэнту ў 1996-м, з папраўкай на бурлівыя дзеі каўкаскіх краінаў: вайну з Гамсахурдзія, пераварот супраць Эльчыбэя, стрэлы ў парлямэнце Армэніі.**

Аднак кожная з падзеяў можа атрымаць нечаканы працяг. Літоўцы могуць, як у пачатку 1990-х, засьведчыць сваю нацыянальную сьпеласьць стрыманымі і ўзважанымі, але неапартуністычнымі ўчынкамі. Змаганьне паміж прэзыдэнтам і заканадаўцамі ва Ўкраіне можа раптам аднаznачна вырашыцца на карысьць аднаго з бакоў. У Грузіі Шэварднадзэ і апазыцыя могуць знайсьці негвалтоўны шлях вырашэньня канфлікту.

Гэткі паварот спраў пазначаў бы нараджэньне пэўнае новае якасьці, пераход постсавецкае краіны на новы ўзровень пакутлівага высьпяваньня самакіраваньне нацыі.

Пакуль, аднак, скрозь бачым знаёмыя сцэнарныя хады з нацыянальнымі дэкарацыямі. Нават клопаты спадара Казуліна з БДУ нагадваюць пэрыпэтыі жыцьця суседзкіх алігархаў — толькі дзе ў расейскіх бізнэсоўцаў мільярды, у беларускіх — тысячы. Там — найбуйнейшыя радовішчы, тут — сьціплая манаполія на перапрацоўку мэталалому (таксама нішто сабе). Там — мэдыяімпэрыі, тут — прэстыжная ВНУ (таксама нішто сабе). Там — аптовае фінансаваньне палітычных партыяў, тут — стрыманыя намёкі пра незабесьпячэньне правільнага галасаваньня студэнтаў. Можа спрацаваць, калі трэба будзе, нішто сабе!

Канфлікт у Расеі вакол Хадаркоўскага разгортваўся ў дэбютнай стадыі паводле асаблівага сцэнару — з ваганьнямі біржы дя спрытным вывадам па-за межы дасягальнасьці смачнага кавалку ў выглядзе «Юкасу». Але, калі зірнуць на вяршыні чыстай палітыкі (то бок на напружанасьць і канфлікты паміж галінамі ўлады), места падаткаплатніка-выбаршчыка сьціплае да непрыстойнасьці: яго імкнуцца пры выпадку выкарыстаць, але як бок з сваімі інтарэсамі ён нікому не цікавы. Характэрная рыса ўсіх гэтых падзеяў — абмежаваны ўдзел грамадзтва. Тарас Бульба імкнецца рэалізаваць сваё славутае права: «Я цябе спарадзіў!..» Дзяржава змагаецца з спараджэньнямі ўласнай волі, а народ выконвае ролю гледача, статыста ды вымушанага спонсара відовішча.

Менавіта выбаршчыку-падаткаплатніку найболей шкодзіць паралюш найвышэйшай улады ва Ўкраіне, няпэўнасьць будучыні (і маральнага абліччa) прэзыдэнта ў Літве, блякаваньне мэханізмаў цывілізаванае зьмены ўлады ў Грузіі. Тут я рашуча аддаю перавагу гістарычнаму аптымізму. Урэшце інтарэсы розных сацыяльных групаў будуць улічаныя — пажадана яшчэ, каб ня шляхам рэвалюцыяў. Усё гэта «толькі» пытаньне часу і наяўнасьці палітыкаў адпаведнага ўзроўню, якія маюць перадолець стан пэрманэнтнага падзелу пірага і нявызначанасьці стратэгічных кірункаў развіцьця краінаў на постсавецкай прасторы. І тут лепей спыніцца, бо памяць нагадвае: 1996. Deja vu.

**Аляксандар Карольчык**



PHOTO.BYMEDIA.NET

На фота зьлева направа: букет, Стражаў, міністар Радзькоў, герб, Казулін

# Казуліна зарэтушавалі

Працяг са старонкі 1.

«Ганаровай высылкі» не атрымалася, Казуліна пакінулі ў зоне дасягальнасьці праваахоўных органаў.

Наступным сыгналам стаўся выхад кніжкі «Исторический выбор Беларуси» зь лекцыяй, прачытанай Аляксандрам Лукашэнкам у БДУ. Кніга рыхтавалася ў Адміністрацыі прэзыдэнта. На фатаздымках у кнізе побач з Лукашэнкам прысутнічаў і Казулін. Але таямніча зьнік. Так у сталінскія часы па меры адстрэлу кадраў рэтушаваліся здымкі Леніна.

Чарговага абвастрэньня сытуацыі не давялося доўга чакаць. 13 лістапада праваахоўныя органы затрымалі кіраўнікоў унітарнага прадпрыемства «Унікаштмэт БДУ» Георгія Корзуна і Вячаслава Саньнікава. Іх падазраюць у крадзяжы амаль 35 кг золата.

На наступны дзень, у пятніцу, афіцыйныя СМІ распаўсюдзілі сэнсацыйную вестку: рэктар БДУ не зьявіўся на допыт у якасьці сьведкі па згаданай справе і яго шукаюць праваахоўныя органы. Рэктар хутка адшукаўся, але ягоная нібыта прыналежнасьць да «залатой справы» ўжо была запушчаная ў СМІ і грамадзтва. Такую інфармацыю дзяржаўная ТВ проста так не пускае.

Лукашэнка адправіў Казуліна ў адстаўку якраз на Дзень студэнта, за тыдзень да дня нараджэньня. Гэта можа быць выпадковасьцю, але нельга выключыць і жаданьне зрабіць рэктару як мага больш балюча. Стыль вельмі характэрны для сёньняшняй улады. Прыгадаем, як у 1996-м вывелі пад рукі ў адстаўку генэрала Мальцава.

Абвінавачаньне затрыманым кіраўнікам «Унікаштмэту БДУ» будзе прад’яўленае толькі да канца тыдня. Вядомая адвакатка Вера Страмкоўская, якая бароніць інтарэсы Вячаслава Саньнікава, праводзіць паралель гэтай справы са справай Васіля Старавойтава, якога яна калісьці бараніла ў судзе. Спачатку ведамства Глухоўскага зацікавілася ягонымі падначаленымі, а пасьля ў «распрацоўку» пайшоў і сам Старавойтаў. Прычым адбывалася гэта на фоне інфармацыйнай атакі, падобнай да той, што мы назіралі на мінулым тыдні. Толькі цяпер Сьледчы камітэт МУС займаецца Аляксандрам Казуліным, які ўжо праходзіць не як сьведка, а як падазроны. Крымінальны кодэкс прадугледжвае за «злоўжываньне службовым становішчам», якое пацягнула за сабой такія наступствы, як «крадзеж у асабліва буйным памеры», ад 8 да 15 гадоў зьняволеньня.

## Досьвед сярэднявечных альхімікаў

Лёс рэктара БДУ быў прадказаў часопіс «Кур’ер» яшчэ ўвесну 2001 г. У нарысе пра Казуліна там адзначалася, што «на кіраўнікоў такога ўзроўню заўсёды хапае кампрамату» і што «ёсьць досьвед сярэднявечных альхімікаў, якіх імпэратары іншы раз, дзеля прафіляктыкі, зьлёгку падсмажвалі за недахоп казённых каштоўных мэталаў».

У чым прычына адстаўкі Казуліна і што яна можа азначаць? Думкі палітолягаў і аналітыкаў наконт гэтага падзяліліся. Юры Дракахруст бачыць у ёй «працяг шырокай кампаніі зачалохваньня намэнклятуры». Разьвіваючы ягоную думку, можна выказаць меркаваньне, што на гэты раз прафіляктыка скіраваная на работнікаў адукацыйнай сфэры, тады як справа Рахманька мусіла заклікаць да парадку транспартнікаў, а арышт Лявонава быў папярэджаньнем усяму дырэктарату. Аляксандар Фядута, аўтар артыкулу ў «Кур’еры», бачыць прычынай адстаўкі барацьбу ўладных кланаў: «Адбылося аслабленьне цэлай групы фігураў, а не аднаго Казуліна. Проста ён аказаўся першы. Відавочна, аслабленьне закране лібэральнае крыло прэзыдэнцкага атачэньня».

Працяг на старонцы 4.

# Ён адказаў за «тупога»

**Надвячоркам у панядзелак рэктар БДУ Аляксандар Казулін апошні раз сустрэўся з студэнтамі. Яны на разьвітаньне зладзілі рэктару абструкцыю.**

Сустрэча ў мурох Ліцэю БДУ была расплянаваная: падрыхтаваныя сьпісы ўдзельнікаў, арганізаванае назіраньне сіламі дэканаў ды куратараў. Стылем паводзінаў А.Казулін нагадваў Лукашэнку на сэлектарных нарадах. Але перад ім сядзелі не паслухмяныя чыноўнікі, а студэнты. Таму сустрэча суправаджалася гучнымі пратэстамі.

Казулін, спазьніўшыся хвілін на дваццаць, выглядаў зьмэнчаным. Сваю кароткую прамову пачаў тлумачэньнем уласных праблемаў з пракуратурай. Гэта выклікала зьедлівыя грымасы на тварах студэнтаў. Сказаўшы рытуальныя фразы аб паляпшэньнях, якія перажывае галоўная ВНУ краіны, рэктар абвесьціў, што электронныя студэнцкія пасьведчаньні з мусовых станець добраахвотнымі. Праўда, толькі на гэты год.

Перайшлі да пытаньняў і адказаў, і зноў загучала тэма студэнцкіх. Студэнт задаў сваё пытаньне па-беларуску, што выклікала нэрвовую рэакцыю ў дэманстратыўна расейскамоўнага рэктара. Казулін прайшоўся па тых, хто «не панімает па-рускі». Заля абурылася. Далей і рэктар стрымліваўся менш, і студэнты. Адказваючы на пытаньне, чаму беларускім грамадзянам па сканчэньні БДУ не выдаюць дакумэнтаў, што сьведчылі б за мяжой пра наяўнасьць ступеняў бакаляўра і магістра, рэктар сарваўся. Ён назваў празьмерна дапытлівага студэнта «тупым». Хлопец у мікрафон абвесьціў, што лічыць словы рэктара абразай, і, выгукваючы «Ганьба!», рушыў з залі. Студэнцтва залямантавала. Казулін паспрабаваў замірыцца, назваўшы закіды студэнта неабгрунтаванымі ды абвесьціўшы, што грамадзянам Беларусі выдаюцца ўсе адпаведныя дакумэнты і дапытлівы пяцікурсьнік атрымае іх таксама. Рэктар дае слова і асабіста прасочыць (заява гучала двухсэнсоўна). Хлопец сышоў.

Заля заціхла. І тут, нібы маланка, прагучала распараджэньне: Казуліна — да міністра. Рэктар папрасіў студэнтаў пачакаць яго хвілінаў дваццаць ды паехаў. Яго месца заняў першы прарэктар сп.Яноўскі. У яго пыталіся — ізноў па-беларуску — наконт ідэалёгіі. Да гонару сп.Яноўскага, адказаў ён салідна і на гэты раз па-беларуску. Маўляў, нічога надзвычайнага ў курсе ідэалёгіі няма, хоць гэта — «балючае пытаньне». Але большасьці было не да таго: студэнты закладаліся, ці арыштуюць рэктара. Казулін вярнуўся. Пра сваю адстаўку, якая, відаць, здарылася ў гэты час, прамаўчаў. Але яго адказы рабіліся ўсё больш рэзкімі.

Адзін з студэнтаў запатрабаваў, каб рэктар перапрасіў за абразу іхнага таварыша. Казулін не зразумеў па-беларуску і зьвярнуўся да дзяўчыны, якая яму пераклала. Казулін з ранейшай фанабэрыяй паўтарыў: да некаторых даходзіць «як да жырафаў», дык ён і выкарыстаў слова «тупыя». Чалавек дваццаць студэнтаў тут жа шумна ўзьняліся зь месцаў і сышлі на знак пратэсту. Улічваючы апалу колісь усясільнага кіраўніка, дэмарш глядзеўся двухсэнсоўна. За першымі пацягнуліся іншыя — хто пратэстуючы, хто сьпяшаючыся сьвяткаваць Дзень студэнта. Кіраўніцтва БДУ амаль адразу распусьціла грамаду. Разьвітальная сустрэча Казуліна з студэнтамі скончылася без авацый.

Пагадзіўшыся з скасаваньнем рэштак акадэмічных свабодаў, Казулінператварыў галоўную ВНУ краіны ў вялікі бізнэс і «палігон для экспэрымэнтаў», — гэтак напісаў пра Казуліна сайт www.studenty.org.

**СР**

# Што такое «Унікаштмэт»

Часопіс «Беларуская думка»* пра «Золата ў попеле»

«Унікаштмэт БДУ» займаецца здабычай каштоўных мэталаў з тэхнагеннага лому. «Яго каманда здолела зрабіць амаль немагчымае: у бурным моры эпохі пераменаў прыдумаць, знайсьці, стварыць сваю справу, замкнуць ланцужок — ад ідэі да яе практычнага ўвасабленьня. І гэты ланцужок залаты! — захаплялася Галіна Булыка ў артыкуле «Золата ў попеле». — Як апярэньне жар-птушкі Фэнікса зьяўляецца зноў і зноў ва ўсім харастве, так і атамы вечных мэталаў зьбіраюцца ў зьлітки на УП «Унікаштмэт БДУ». Летась прадпрыемства вырабіла тых самых зьліткаў на 8,5 млрд руб. Там апрацоўваюць 300—400 кг сыравіны ў месяц. На сёньня большая частка ўсяго беларускага залатога запасу — золата, зробленае ў Беларусі (у 1995 г. беларускае золата складала толькі 5% ад усяго запасу). На прадпрыемстве працуюць пад 150 чалавек. Кіраваў з моманту ўтварэньня кандыдат хімічных навук Г.Корзун.

«Унікаштмэт» перапрацоўвае 60 з 75 асноўных відаў лому, які ўтрымлівае каштоўныя мэталы. Асноўныя працы вядуцца ў галіне канцэнтраваньня мэталаў з выкідаў (напрыклад, з кантактаў у злучэньнях сьпісаных кампутараў, цеплаізалятараў ад шклоплавільных агрэгатаў, адпрацаваных каталізатараў).

БДУ пачаў займацца тэхналёгіямі здабычы золата яшчэ ў 1994 г. Тады ўнівэрсытэт і НДА фізыка-хімічных праблем БДУ пачалі працу па атрыманьні каштоўных мэталаў з тэхнагеннай сыравіны. Ініцыятыва належала сёньняшняму прарэктару па навуцы С.Рахманаву і дырэктару НДА ФХП А.Івашкевічу, а ўзначалілі працу кандыдаты хімічных навук Е.Гусеў і Г.Корзун. У 1998 г. хімікі прапанавалі ўвесь тэхналягічны працэс рабіць на радзіме. Тэхналягічныя ўстаноўкі былі сабраныя з падручнага матэрыялу, з частак старых агрэгатаў і нават бакаў побытавых пральных машынаў. Рашэньне аб стварэньні «Унікаштмэту» было прынята ў 1999 г. на нарадзе ў Лукашэнкі. Аб’ядналі навукова-вытворчае прадпрыемства «Квант», ДП «БелВКМ» і навукова-вытворчы цэнтар хіміі каштоўных мэталаў БДУ, якія займаліся першаснай перапрацоўкай радыёэлектроннага лому і выкідаў кінафотаматэрыялаў. Паўфабрыкат адпраўлялі ў Расею альбо на Захад, дзе раней і выплаўляліся каштоўныя мэталы».

* Часопіс «Беларуская думка» выдаецца Адміністрацыяй прэзыдэнта. Артыкул Галіны Булыкі «Золата ў попеле» быў надрукаваны ў №7’2003 (ліпень).

# Няроўная доля

## «Народнай Волі» далі 50–мільённы штраф за абзац, які дзяржаўным СМІ не каштаваў бы нават прабачэньняў

17 лістапада калегія Менскага гарадзкога суду, разгледзеўшы касацыйную скаргу раённай пракуратуры і рэдакцыі «Народнай Волі», нечакана ня толькі перагледзела рашэньне раённага судзьдзі, але і павялічыла ў пяць разоў памер кампэнсацыі, якую газэта мусіць сплаціць старшыню «Белтэлерадыёкампаніі» Ягору Рыбакову. Цяпер гэта 50 млн руб. з газэты і па 3 мільёны з журналісткі Марыны Коктыш і Элеаноры Язэрскай.

Падставай для судовае справы стаўся матэрыял «Пяць пудоў любові я гарантую», апублікаваны ў «НВ» у кастрычніку 2001 г. Камэнтуючы зьмены на тэлевізіі, Язерская назвала Рыбакова ў шэрагу асобаў, якія «ператварылі БТ у руіны», а пасьля адзначыла, што самагубства адсунутай ад этэру Юліі Касмачовай і сьмерць экс-старшыні БДТРК Валер'я Скварцова «на сумленьні гэтых людзей». Не прайшло й двух гадоў, як Рыбакоў зьвярнуўся ў суд — маўляў, зьвесткі згаданага матэрыялу не адпавядаюць рэчаіснасьці, «ганяць дзелавую рэпутацыю, прыніжаюць гонар і годнасьць». Патрабаваў абвяржэньня ў «НВ» і прабачэньняў. Але ў залі суду нечакана зажадаў і матэрыяльнае кампэнсацыі: 200 млн руб. з газэты і па 20 млн з Коктыш і Язэрскай.

Судзьдзя Сяргей Хрыпач пастанавіў спагнаць з «НВ» на карысьць Рыбакова 10 млн руб., а з Коктыш і Язэрскай — па мільёну. Нават пракурор Ленінскага раёну Аляксей Стук накіраваў у суд касацыйны пратэст з патрабаваньнем справу перагледзець: ён палічыў не адпаведным закону як памер «маральнае шкоды» (два гады ж прайшло!), так і разгляд справы без прысутнасьці адвакатаў. Абодва бакі таксама падалі касацыйныя скаргі: журналісты настойвалі на адмене прысуду, Рыбакоў — на першапачатковай суме. Яго патрабаваньне і падтрымаў Менскі гарадзкі суд.

Пяцьдзясят мільёнаў — вялізная сума, тым больш што, паводле словаў І.Сярэдзіча, сёньня выданьне незалежнай газэты цяжка назваць бізнэсам: «У дачыненьні да незалежных газэт існуюць дыскрымінацыйныя тарыфы што да распаўсюду. У нас жорсткая эканомія, адзін чалавек працуе як пятнаццаць у дзяржаўных выданьнях. Але накладзены штраф ніяк не адаб'еццa на выхадзе газэты. Дый справа ня ў суме. Справа ў тым, каб суд справядліва падышоў да вырашэньня гэтага канфлікту. Пра якія 50 млн можа весьціся гаворка, калі за справу на Нямізе ніхто не заплаціў ніводнага рубля?»



АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

Іосіф Сярэдзіч, нязьменны рэдактар «Народнай Волі», не губляе аптымізму

Газэта мае намер падаваць скаргу ў наглядным парадку ў прэзыдыюм гарадзкога суду, а калі спатрэбіцца — і ў Вярхоўны суд. «Я спадзяюся, што ў прэзыдыюме гарадзкога суду альбо ў Вярхоўным перамогуць праўда і справядлівасьць, — кажа Марына Коктыш. — Штраф, які присудзілі мне і Язерскай, не прапарцыйны ні нашым заробкам, ні маральным пакутам Рыбакова. Мой месячны заробак складае 234 тысячы рублёў. Я цэлы год мушу працаваць толькі на выплату штрафу. Мне хочацца верыць, што старшыня БДТРК хоць трошачку мужчына і джэнтэльмэн і што недзе глыбока ў душы яму таксама непрыемная гэтая сытуацыя. Я думаю, што гэта быў загад з мэтай зьнішчыць адзіную незалежную штодзённую грамадзка-палітычную газэту. Чаму падставай стаў менавіта гэты артыкул — для мяне сакрэт. Я думаю, што калі б Рыбакоў хацеў, ён бы падаў скаргу на газэту адразу ж пасьля публікацыі артыкулу, а гэта было ў кастрычніку 2001 году. Відаць, тады яго гэта ня вельмі хвалявала».

Вінаватай у абразе гонару і годнасьці Рыбакова спн.Коктыш сябе ня лічыць: «Я толькі перадавала меркаваньне Язерскай, а тая, у сваю чаргу, спасылалася на іншых людзей у Белтэлерадыёкампаніі. Былыя супрацоўнікі БДТРК напісалі ліст у суд, дзе яны яны пацьвярджалі словы Язерскай. Яны гатовыя былі сьведчыць пра складаную маральна-псыхалягічную атмасфэру, якая склалася ў кампаніі, пра свае станы, блізкія да суіцыду. Аднак гэты ліст нават ня быў зачытаны на судовым паседжаньні, хаця ён быў зарэгістраваны ў канцылярыі суду».

Застаюцца спадзяваньні, што ўлады толькі палохаюць газэту і вышэйшыя судовыя інстанцыі перагледзяць прысуд. Вэрдыкт судзьдзі Жупікавай, вынесены пасьля шэрагу выпадаў Аляксандра Лукашэнкі на адрас «Народнай Волі», вымусіў чарговы раз пераканацца ў залежнасьці судовай сыстэмы ад выканаўчай улады.

**Вераніка Дзядок, Сяргей Мікулевіч**

# Казуліна зарэтушавалі

**Працяг са старонкі 3.**

Фядута ідэнтыфікуе лібэралаў найперш з Канаплёвым ды канстатуе ўзмацненьне «сілавікоў». На ягоную думку, Казуліна цяпер «забіваюць палітычна». У той жа час, гаворачы пра палітычныя пэрспэктывы ўжо былога рэктара, публіцыст адзначае, што ў яго быў шанец на перамогу «толькі ў адзіным выпадку — калі б Лукашэнка прызначыў яго пераемнікам».

Трэба адзначыць, што ў 2001 г. рэктар БДУ — магчыма, з уласнае волі — разглядаўся як дублёр апазыцыйнага кандыдата ў прэзыдэнты краіны. Пасьля гэтага і пайшла ўніз кар'ерная крывая рэктара, які датуль сам пасьпяхова душыў студэнцкі рух і пазбавіў унівэрсытэт ад «небясьпечных» дэканаў.

Паводле інфармацыі «НН», з прадпрыемствам «Унікаштмэт БДУ» маглі расправіцца з дапамогай патэнцыйных канкурэнтаў. За апошнія гады «Унікаштмэт» стаў у Беларусі манапалістам у «залатой» галіне. Канкурэнты і адпомсьцілі, калі пэўныя сілы шукалі кампрамат на Казуліна.

Афіцыйную пазыцыю выказаў Урал Латыпаў. Рэктар, насуперак патрабаваньням прэзыдэнта, не хацеў вяртацца да мадэлі «клясычнага ўнівэрсытэту», інсьпіруючы стварэньне ў БДУ вытворчых прадпрыемстваў і «нетрадыцыйных» факультэтаў. А тут якраз генпракурор Шэйман папрасіў вызваліць Казуліна ад пасады на час сьледзтва па справе «Унікаштмэту». Рэктара «адставілі» зусім — каб не пакідаць унівэрсытэту «ў падвешаным стане». У гэтым тлумачэньні ўсё сыходзіцца, акрамя аднаго: навошта такая піяр-кампанія вакол гэтае справы ў дзяржаўных СМІ.

Такі інфармацыйны шум у лукашэнкаўцаў заўсёды азначаў пачатак новага палітычнага цыклу. Ён супаў у часе з увядзеньнем у ВНУ курсу «ідэалёгіі беларускай дзяржавы» і можа быць недвухсэнсоўным знакам унівэрсытэцкім асяродзьдзям, каб тыя адчулі вастрыню палітычнага моманту.

На месца Казуліна прыходзіць па апаратных мерках раўнавартая замена — Васіль Стражаў. Прычым Стражава не назавеш меншым лібэралам, чым Казулін. Праўда, пасада ў БДУ больш ня мае таго значэньня, якое на мела тры гады таму.

**Сяргей Ёрш**

ШТРЫХ

## Казулін і «Юкас»

26 лістапада 2001 г. БДУ разам з расейскай Фэдэрацыяй інтэрнэт-адукацыі адчыніў інтэрнэт-цэнтар для адукацыі настаўнікаў. Там былі ўсталяваныя 50 кампутараў, падлучаных да Інтэрнэту. Грошы на стварэньне цэнтру (125 тыс. даляраў) выдаткавала расейская нафтавая кампанія «Юкас», яна ж дэкляравала выдзяляць 140 тыс. даляраў штогод на дзейнасьць структуры. Зь беларускага боку выдавалася памяшканьне ў Рэспубліканскім інстытуце вышэйшай школы БДУ і доступ да Інтэрнэту ад Міністэрства адукацыі.

**Аркадзь Шанскі**

# «Паксасгейт»: новыя доказы

**Каманда Раландаса Паксаса перад прэзыдэнцкімі выбарамі спрабавала зрабіць банкрутам найбуйнейшы ў Літве банк — «Vilniaus Bankas». Атаку на яго аплачваў галоўны спонсар Паксасавай выбарчай кампаніі грамадзянін Расеі Юры Барысаў.**

Спэцыяльная парлямэнцкая камісія, якая расьсьледуе скандал вакол Паксаса, абвінавачанага ў супрацы з расейскімі крымінальнымі структурамі, у аўторак на тайным пасяджэньні праслухоўвала запісы тэлефонных размоваў. У тым ліку дыялёг дарадцы прэзыдэнта ў міжнародных пытаньнях Рэмігіюса Ачаса з Барысавым. Ачас раіў «спонсару» як мага хутчэй забраць свае ўклады з «Vilniaus Bankas», бо той у вельмі хуткім часе «павінен збанкрутаваць».

Наймацнейшым ударам па банку сталася публікацыя, якая прадказвала яго хуткі крах, у віленскай вячэрняй газэце «Vakaro Zinios». Газэта, якая звычайна выходзіць тыражом 40 тыс. экзэмпляраў, гэтым разам мела 350-тысячны наклад. Асобнікі раздавалі бясплатна па ўсёй краіне, асабліва старэйшым людзям. У распараджэньні камісіі, што займаецца «паксасгейтам», знаходзіцца таксама запіс тэлефоннай размовы, у якой Ачас называе Барысаву нумары рахункаў, на якія расеец павінен пераслаць грошы на друк газэты.

Дзясяткі тысяч дробных укладчыкаў усталі ў даўжэзныя чэргі да касаў, у паніцы намагаючыся забраць уклады, і незадоўга перад другім турам прэзыдэнцкіх выбараў, у студзені, «Vilniaus Bankas» сапраўды сутыкнуўся зь цяжкасьцямі. Пярэпалахам скарыстаўся выбарчы штаб Паксаса, які ўсю віну ўсклаў на дзейнага прэзыдэнта і фаварыта ў блізкім ужо другім туры выбараў Валдаса Адамкуса.

Банк, які ўваходзіць у швэдзкую групу SEB, выстаяў, але, як падлічылі экспэрты, дзеля яго ўратаваньня ўладальнікі вымушаныя былі выдаткаваць пад 150 млн даляраў.

Скандал вакол прэзыдэнта Літвы выбухнуў у канцы кастрычніка, калі літоўскія спэцслужбы агучылі рапарт, які абвінавачваў дарадцаў прэзыдэнта ў дзейнасьці на карысьць расейскіх мафіёзных структураў. Камісія падазрае, што ўплываць на рашэньні літоўскіх уладаў спрабавалі расейскія спэцслужбы. Барысаў — гэта ключавая фігура ў афэры. За ім цягнуцца абвінавачаньні ў пастаўках вайсковага абсталяваньня ў краіны з падазронай рэпутацыяй. Паксас зрабіў яго галоўным спонсарам сваёй выбарчай кампаніі. Грашыма Барысава былі аплачаныя, сярод іншага, паслугі расейскіх спэцыялістаў у галіне брудных перадвыбарчых тэхналёгій.

Камісія павінна была ў аўторак таксама пазнаёміцца з дамовай паміж Паксасам і Барысавым, у адпаведнасьці зь якой Паксас абавязваўся пасьля перамогі, у прыватнасьці, зьняць з пасад кіраўнікоў спэцслужбаў, якія перашкаджалі расейцу ў ягоным бізнэсе, а яго самога зрабіць галоўным сярод сваіх дарадцаў. Барысаў, у мінулым маёр савецкага войска, патрабаваў сабе званьне генэрала літоўскага войска, паведамляе «Gazeta Wyborcza».

**ФС**

# Чэргі па грошы ў «Western Union»

У краіне функцыянуе ўжо 460 пунктаў абслугоўваньня кліентаў па сыстэме пераводу грошай «Western Union». 55% зь іх знаходзіцца ў «Беларусбанку». Гэтая зручная сыстэма грашовых пераказаў абслугоўвае выключна міжнародныя трансакцыі. Паводле статыстыкі, у Беларусі 80% пераводаў прыходзяць з-за мяжы і толькі 20% ідуць зь Беларусі за межы краіны. Сярэдняя сума пераказу — 340 даляраў.

За гэтымі лічбамі хаваецца ні што іншае, як пагаршэньне эканамічнай сытуацыі ў краіне. Зазвычай грашовыя пераводы праз «Western Union» робяць для сваякоў беларусы, якія працуюць за мяжой. Частай зьявай сталі чэргі на атрыманьне грошай у такіх пунктах! Беларусь робіцца другой Малдовай ці Азэрбайджанам, гіганцкая частка насельніцтва якіх стала працуе па-за межамі краінаў, забясьпечваючы такім чынам сродкі для існаваньня сваякам, што засталіся ў хаце.

Напрамкаў эміграцыі працоўных рэсурсаў у Беларусі два: Захад і Ўсход. Адных студэнтаў у 2003 г. за мяжой было працаўладкавана 4306 чалавек. Гэта ў два разы больш, чым летась. Большасьць студэнтаў (3535 чалавек) паехалі задавальняць попыт на танную працоўную сілу ў Злучаныя Штаты. А калі б ня жорсткая візавая палітыка амбасады ЗША ў Беларусі, гэтая лічба была б яшчэ на 30% вышэйшай.

Што тычыцца, бадай, найбольш істотнага кірунку міграцыі працоўных рэсурсаў — Расеі і асабліва Масквы, дык тут не існуе ніякай статыстыкі. Абсалютная большасьць беларусаў працаўладкаваныя там нелегальна. Самы распаўсюджаны занятак — будаўніцтва, рамонт і аздабленьне інтэр'ераў. Нязначную частку працоўных мігрантаў складаюць спэцыялісты — дызайнэры, архітэктары і г.д .

Міграцыя працоўных рэсурсаў мае як станоўчыя, так і адмоўныя эфэкты. З аднаго боку, яе наяўнасьць сьведчыць пра кепскую эканамічную сытуацыю ў краіне, нізкую ступень эканамічнай свабоды, што не дае разьвівацца бізнэсу і ствараць новыя працоўныя месцы. Ані эстонцы, ані палякі ў Маскву батрачыць ня езьдзяць. А езьдзяць толькі жыхары краінаў з аўтарытарнымі рэжымамі. Зьяжджаюць за мяжу найбольш актыўныя і кваліфікаваныя працоўныя, а застаюцца тыя, што могуць працаваць толькі «ад плоту да абеду».

Зь іншага боку, працоўныя мігранты забясьпечваюць прыток у краіну дадатковых грашовых рэсурсаў і лепшыя варункі жыцьця для сябе і сваіх сваякоў. Павялічваецца ўнутраны попыт і здымаецца напружаньне на рынку працоўных рэсурсаў. Калі б не магчымасьць выехаць на працу за мяжу, беспрацоўных у краіне было б значна больш. Акрамя таго, заходнія, дый маскоўскія, спажыўцы патрабуюць лепшае якасьці працы, што дысцыплінуе беларускіх працоўных і вучыць іх рабіць згодна з высокімі стандартамі. Нарэшце, калі сытуацыя ў краіне зьменіцца і мігранты вернуцца, мы займеем вялікую колькасьць падрыхтаваных і дасьведчаных працоўных, якія будуць працаваць ужо на карысьць толькі нашай краіны.

**Дамінік Міхайловіч**

## ЭКАНАМІЧНАЯ ХРОНІКА

### Захады Эўракамісіі супраць Беларусі

**Эўракамісія не павялічыць беларускіх квотаў на экспарт тэкстылю ў Эўразьвяз.** Брусэль тлумачыць гэта парушэньнямі дэмакратыі і правоў чалавека ў Беларусі. ЭЗ вядзе кансультацыі зь Менскам толькі пра падаўжэньне старога пагадненьня. Штогод у Эўразьвяз прадаецца беларускіх тэкстыльных вырабаў на 120 млн даляраў, а экспартны патэнцыял складае 180 млн. Тэкстыль — другі найбуйнейшы артыкул беларускага экспарту ў ЭЗ пасьля калійных угнаеньняў.

### Мільён мабільнікаў

**Апэратары сотавай сувязі дэкляруюць, што колькасьць абанэнтаў сувязі перавысіла мільён.** 600 тысячаў абанэнтаў мае «Вэлкам», 380 — у «МТС» і з 20 тысячамі ў аўтсайдэрах застаецца «Белсел». Аглядальнікі мяркуюць, што гэтыя лічбы могуць быць у некаторай ступені завышанымі.

### Рост інфляцыі

**У кастрычніку падскочылі тэмпы інфляцыі.** З пачатку году цэны ўзьняліся ўжо на 20,6%. Для параўнаньня: інфляцыя ў зоне эўра за 10 месяцаў склала 1,6%.

### «Фіят Панда» — машына году

**Новы «Фіят Панда» прызнаны эўрапейскім «Аўтамабілем-2004», абвесьціла журы з 58 журналістаў буйных эўрапейскіх аўтавыданьняў.** Другое месца падзялілі «Мазда-3» і новы «Фальксваген-Гольф-V».

Эўрапейскія аўтавытворцы перажываюць ня лепшыя часы. За 10 месяцаў на дарогі Эўропы выехала 12 млн 188 тыс. новых аўто, што на 1,3% менш, чым летась. Толькі карэйскія і японскія фірмы павялічылі свае продажы адпаведна на 18,9% (да 399 тыс. машын) і на 8% (да 1,55 млн машын).

### «СЭР» за зьмены Падатковага кодэксу

**Дэпутацкая група «Спрыяньне эканамічнаму разьвіцьцю» прапануе высьветліць, ці адпавядаюць Канстытуцыі асобныя палажэньні Падатковага кодэксу.** Самы спрэчны пункт дакумэнту — прымусовае адчужэньне маёмасьці падаткаплатніка па рашэньні падатковага органу ў выпадку, калі ёсьць запазычанасьць за падаткі. Дэпутаты мяркуюць, што адчужэньне ня можа ажыцьцяўляцца ў пазасудовым парадку. Каб дэпутацкі запыт быў накіраваны ў Канстытуцыйны суд, за яго мусіць прагаласаваць большасьць парлямэнтароў. Шанцаў на гэта няшмат.

### Купляй сваё

**Урад абавязаў гандлёвыя прадпрыемствы мець у агульным аб'ёме тавараабароту ня менш за 70% тавараў айчыннай вытворчасьці.** Патрабаваньне датычыць крамаў, якія знаходзяцца пад крылом Мінгандлю, Белкаапсаюзу і выканкамаў.

### Кампэнсацыі за заходнебеларускую маёмасьць

**Паводле рашэньня польскага Сойму, «забужане», г.зн. грамадзяне Польшчы, што страцілі нерухомасьць у Заходняй Беларусі й Украіне пасьля другой сусьветнай вайны,** маюць права на кампэнсацыі ў памеры 15% ад кошту нерухомасьці, але ня больш за 50 тыс. злотых (13 тыс. даляраў). Гэтая квота будзе ім залічвацца на рахунак купленай у дзяржавы нерухомасьці. Права на кампэнсацыі маюць тыя, хто жыў на тэрыторыях, што належалі да Польшчы, на момант 1 верасьня 1939 г., мае цяпер польскае грамадзянства і пражывае ў Польшчы стала.

**МБ; БелаПАН**

# Закон дацягваюць да дэкрэту

**Вынесеныя на абмеркаваньне парлямэнту зьмены у закон аб дзейнасьці палітычных партыяў не дэмакратычныя, але адарваныя ад практыкі. «Народнай кааліцыі 5+» яны не павінны зашкодзіць.**

Паводле законапраекту, які разглядае палата прадстаўнікоў, саюзы палітычных партыяў ня маюць права ўдзельнічаць у падрыхтоўцы і правядзеньні выбараў, высоўваць кандыдатаў і праводзіць за іх агітацыю, а таксама ўтвараць выбарчыя блёкі для ўдзелу ў перадвыбарчых кампаніях і выбарах. Акрамя таго, саюзы палітычных партыяў мусяць рэгістравацца ў Мінюсьце. За два пісьмовыя папярэджаньні Мінюсту саюз можа быць ліквідаваны.

Практычна законапраект толькі прыводзіць закон у адпаведнасьць з дэкрэтам прэзыдэнта ад 11 верасьня 2003 г. З часу апублікаваньня дэкрэту кантроль за партыямі і НДА з боку пракуратуры і Мінюсту ажыцьцяўляецца менавіта на падставе яго, а не закону.

Як патлумачыў старшыня АГП Анатоль Лябедзька, гэтыя папраўкі маюць сэнс толькі ў той выбарчай сыстэме, якая прадугледжвае прапарцыйнасьць і мінімальны цэнз для праходжаньня ў парлямэнт. У нас гэтага няма, таму законапраект адарваны ад практыкі і ніяк ня можа паўплываць на стварэньне кааліцый. На парлямэнцкіх выбарах мы галасуем не за партыі, а за кандыдатаў, так што забараняць выбарчыя блёкі бессэнсоўна.

У той жа час А.Лябедзька мяркуе, што падрыхтоўка законапраекту наўпрост зьвязаная з паўстаньнем апазыцыйнай перадвыбарчай кааліцыі: «Гэта падкрэсьлівае, наколькі ўлады сур'ёзна захапочаны магчымасьцю стварэньня шырокай народнай кааліцыі. Але я ня думаю, што зацьвярджэньне законапраекту паўплывае на нашу кааліцыйную дзейнасьць. Мы толькі вымушаны будзем карэктаваць фармулёўкі і выпрацоўваць адэкватную тактыку сваіх дзеяньняў».

Разгляд законапраекту ў камісіях прызначаны на 24 лістапада. Да канца году палата мае яго зацьвердзіць, мяркуе Яўген Будай, загадчык аддзелам па забесьпячэньні дзейнасьці камісіі па правах чалавека, нацыянальных стасунках і СМІ. Заўвагі дэпутатаў, найхутчэй, будуць мець тэхнічны характар. Як заўжды.

**Вераніка Дзядок**

## ХРОНІКА ЎЦІСКУ

11 лістапада судовае папярэджаньне за ўдзел у несанкцыяваным шэсьці на Дзяды атрымалі сябры Віцебскай суполкі КХП-БНФ **Тамара Мамчыц** і **Алег Емяльянаў**. За тое ж шэсьце 17 лістапада **Аляксандар Салаўян** атрымаў судовае папярэджаньне, а **Ўладзімер Плешчанка** — штраф у 150 базавых адзінак, ці каля 2,5 млн руб. (агульная сума штрафаў, накладзеных на У.Плешчанку, ужо складае 11 млн руб.). А.Салаўян, да таго ж, правёў суткі ў сьледчым ізалятары пасьля затрыманьня 2 лістапада. Т.Мамчыц мае намер абскарджваць дзеяньні міліцыянтаў, якія двойчы абразілі яе гонар: зьдзекаваліся зь беларускай мовы ды заяўлялі, што яна ўдзельнічае ў акцыі за амэрыканскія грошы.

12 лістапада ў Менску на прэзэнтацыі трыб'юту «NRM», падчас распаўсюду ўлётак з заклікам прыйсьці на акцыю 24 лістапада, былі затрыманыя актывісты незарэгістраванага «Маладога фронту» **Артур Фінькевіч**, **Эдвард Зелянкоў**, **Вольга Вараб'ёва**, **Алена Скрабунова** і непаўналетні **Барыс Гарэцкі**. Першыя чацьвёра правялі ноч у гараддзеле міліцыі №1, а 13 лістапада былі асуджаныя паводле арт.167 Адміністрацыйнага кодэксу (удзел у несанкцыяваных вулічных акцыях): А.Фінькевіч пакараны адміністрацыйным арыштам на 15 сутак (гэта першы ў Беларусі арышт за распаўсюд улётак), астатнія — штрафамі ў памеры 20 базавых адзінак (330 тыс. руб.). Б.Гарэцкага адпусьцілі дадому: яго чакае разбор справы на раённай камісіі па справах непаўналетніх.

У Гомелі 12 лістапада адбыўся суд над арганізатарамі «народнага рэфэрэндуму» наконт трэцяга прэзыдэнцкага тэрміну: сябры АГП **Алесь Карніенка** і **Васіль Палякоў** былі асуджаныя на штраф у 100 базавых адзінак кожны. 15 лістапада ў Менску падчас распаўсюду ўлётак супрацоўнікамі АМОНу быў затрыманы й зьбіты непаўналетні «маладафронтавец» **Мікіта Красноў**.

**АШ**

### ВНУ з вайсковымі катэдрамі

**Савет міністраў Беларусі зацьвердзіў пералік ВНУ, дзе будуць вайсковыя катэдры, г.зн. дзе ў студэнтаў будзе магчымасьць стаць афіцэрамі запасу бяз службы ў войску.** Гэта Беларускі дзяржаўны ўнівэрсытэт, Беларускі нацыянальны тэхнічны ўнівэрсытэт, Беларускі дзяржаўны ўнівэрсытэт інфарматыкі і радыёэлектронікі, Беларускі дзяржаўны ўнівэрсытэт транспарту, Менскі дзяржаўны вышэйшы авіяцыйны каледж, Беларускі дзяржаўны лінгвістычны ўнівэрсытэт, а таксама Гарадзенскі, Віцебскі, Гомельскі мэдычныя ўнівэрсытэты.

### Бывайце, «Пагонькі»

**30 сьнежня — апошні дзень аьбмену купюраў узору 1992—99 гадоў на новыя, узору 2000 году.** Пасьля 30 сьнежня старыя грашовыя знакі страчваюць статус законнага сродку плацяжу. Апошні год грошы з «Пагонькамі» абменьваюць выключна абласныя ўправы і раённыя аддзяленьні Нацбанку.




# Беларускія «500 дзён»

Працяг са старонкі 1.

Акрамя таго, аўтараў кансультавалі 24 беларускія экспэрты.

У абмеркаваньні праграмы, што адбылося 13 лістапада ў Рэдакцыі «НН», бралі ўдзел каардынатары праекту — філёзаф Алесь Анціпенка і галоўны рэдактар часопісу «ARCHE» Валер Булгакаў, а таксама палітолягі Ўладзімер Мацкевіч, Віталь Сіліцкі і Андрэй Казакевіч, юрыст Сяргей Леўшуноў, журналіст Аляксандар Фядута. Ад Рэдакцыі «НН» у гутарцы бралі ўдзел галоўны рэдактар «НН» Андрэй Дынько і агляднікі Анатоль Сідарэвіч ды Лёлік Ушкін.

**А.Дынько**: Ці можна «Сцэнары рэформаў» Анціпенкі-Булгакава-Сіліцкага параўнаць з расейскай праграмай «500 дзён», якая павінна была радыкальна рэфармаваць тагачасны СССР?

**В.Сіліцкі**: Тая праграма так і не была зрэалізаваная, але дала штуршок іншым распрацоўкам. Такія праекты дастатковыя ўжо сваёй наяўнасьцю. У Польшчы за вайсковым часам існавалі падпольныя «фабрыкі думак», што працавалі над праектамі, часу рэалізацыі якіх ніхто не ўяўляў. Якая частка іх была насамрэч рэалізаваная — гэта вялікае пытаньне, бо лёгіка падзеяў часам прымушае рабіць з дакладнасьцю наадварот. Але працэс інтэлектуальнай эвалюцыі каштоўны сам па сабе. Сутнасьць гэтай кнігі — што павінна зрабіць Беларусь для таго, каб стаць эўрапейскай краінай.

**У.Мацкевіч:** Па-за рамкамі інтэграцыі існаваць у Эўропе немагчыма, і туды трэба здаваць іспыты: ці здольная нацыя ікс увайсьці ў гэтыя праект? Ці здалі беларускія інтэлектуалы іспыт гэтай кніжкай? Не, бо тут шмат недарэчнасьцяў. Вось у кнізе ёсьць пра ўласнасьць на зямлю, але толькі што да сельскагаспадарчых земляў. А мы жывём ва ўрбанізаванай краіне! У горадзе неадкладна патрабуецца зямельная рэформа.

«500 дзён» былі нават не праграмай, а плянам: усё было пакладзена на час. Там была пасьлядоўнасьць крокаў, а ў гэтай кнізе пасьлядоўнасьць крокаў ёсьць толькі ў чацьвертай частцы.

**Л.Ушкін**: Такія пляны — набытак пасьляваеннага часу, калі праводзіліся структурныя рэформы ў Нямеччыне й Японіі. Гэта былі рэформы пад акупацыяй ці ва ўмовах нестабільнай палітычнай сыстэмы: няма апазыцыі, няма прафсаюзаў. І гэтая праграма напісаная для выпадку, калі ў Беларусі будзе ўсталяваны, як у Іраку, «нармалёвы амэрыканскі рэжым». Слабы бок праграмы ў тым, што яна ігнаруе пытаньне сацыяльнага кошту рэформаў. Чаму яе павінны падтрымліваць, напрыклад, прафсаюзы?

**А.Казакевіч:** Гэта не праграма дзеяньняў. Гэтая кніга — хутчэй паліттэхналёгія, сродак «усім» паказаць, што ёсьць «сцэнары рэформы», але без інфармацыі пра тое, якія практычныя крокі трэба зрабіць, без падрабязнага апісаньня «праекту рэформаў».

Напрыклад, у разьдзеле «Судовая сыстэма» многа проста фантастычных прапановаў, адарваных ад рэальнасьці.

## Маніфэст для беларускага ПінаЧэта

**В.Булгакаў**: У адказ на крытыку я хацеў бы ўдакладніць, што на ўласна «праграмы» рэформаў у кнізе і не адводзілася ўсяго месца. Задача была шырэйшая: даць агляд дасюлешніх ідэяў і праграмаў рэфармаваньня грамадзтва, паставіць дыягназ сучаснага стану чатырох найважнейшых сэктараў грамадзтва (палітыка, эканоміка, адукацыя, сацыяльная сыстэма), акрэсьліць выклікі й матывацыі рэформ і толькі пасьля абазначыць кірункі іх рэалізацыі. Таму кніга будзе карысная як дапаможнік палітычна актыўнаму беларусу. Напачатку мы разглядалі й праект напісаньня распрацаванай да драбніцаў праграмы з «даручэньнямі» канкрэтным ведамствам, але ўрэшце пайшлі іншым шляхам.

Распрацаваныя сцэнары маюць на мэце ня проста дэмакратызаваць Беларусь, а выканаць вымогі, якія ставяцца перад краінамі, што жадаюць увайсьці ў ЭЗ. І гэта важны пункт. Калі ў краіне ўжо ёсьць партыі й рухі, якія заклікаюць зьдзейсьніць эўрапейскі выбар, то цяперашні рэжым ня бачыць Беларусі часткай эўрапейскай палітычнай супольнасьці. Але нават сярод часткі апаратчыкаў ёсьць усьведамленьне: калі ня рушым у бок эўраатлянтычнай супольнасьці, дык будзем больш а больш ператварацца ў краіну трэцяга сьвету, губляць сваё нацыянальнае аблічча. Дарэчы, у «НН» крыху няправільна быў пастаўлены акцэнт: гэта сцэнары не для дэмакратычнага ўраду, а для праэўрапейскага.

**А.Фядута**: Шкада, што ў кнізе не прааналізаваная праграма першага лукашэнкаўскага ўраду, ураду Чыгіра, напісаная Лінгам. Гэта была першая і адзіная праграма лібэралізацыі эканомікі, якая ішла ад ураду: яна прадугледжвала толькі рэфармаваньне эканомікі, дэмакратызацыя палітычнай сыстэмы ў задачу не ўваходзіла. Лукашэнка яе затармазіў праз паўгоду, хоць плёнам таго, што зрабілі Багданкевіч у фінансавай сфэры, Мясьніковіч у эканамічнай, Сініцын у адміністрацыі, ён скарыстаўся. Дарэчы, у 1994 г. Лукашэнка сапраўды напісаў Яўлінскаму ліст з запрашэньнем прыехаць. Яўлінскі тады адмовіўся, бо палічыў запрашэньне несур'ёзным.

Рэалізаваць напісанае тут немагчыма — адчуваецца, што аўтары ніколі не пісалі праграмаў, разьлічаных на дзяржаўную рэалізацыю. Але, надумай прэзыдэнт Беларусі праводзіць рэформы, кніга магла б стаць маніфэстам беларускага ПінаЧэта. Аляксандар Рыгоравіч на гэта ня здольны: ён паталягічна баіцца рэформаў.

## Мы іх баімся, а яны ідуць

**У.Мацкевіч**: Пры рэалізацыі праграмы немагчыма не баяцца: надта вялікі адсотак няпэўнасьці. Трэба казаць пра наяўнасьць палітычнай волі, якой у Лукашэнкі няма.

**В.Сіліцкі**: Сёньня боязь пераменаў — гэта страх перад пераменамі, якія ўжо ідуць. Калі пачынаюцца перамены, людзям няма часу думаць пра іх: яны становяцца ўдзельнікамі тых зьменаў... Што да сацыяльнага блёку, паглядзіце, дзе ён будзе праз 3—4 гады. Дзе бясплатная адукацыя? Мэдычная абарона?

**С.Леўшуноў:** Калі нехта абвесьціць рэформы ў якасьці сваёй прэзыдэнцкай перадвыбарнай праграмы, ён будзе адрынуты. У параўнаньні з часам тых жа «500 дзён» сытуацыя ў грамадзтве зьмянілася: чаканьняў лепшай будучыні ў выніку сыстэмнай трансфармацыі ўжо няма. Грамадзтва ўвайшло ў фазу плаўнага спакойнага жыцьця. Здольнасьць прэзыдэнта растлумачваць некаторыя рэчы зьмякчае ўспрыманьне сытуацыі. Калі б рэзкае павышэньне кватэрнай платы правёў лібэрал, рэакцыя была б зусім іншая, чым на палітыка кшталту Лукашэнкі. Таму надзеі на рэформы ў нашым грамадзтве пры народнай падтрымцы роўныя нулю. Такія рэформы можна было б ажыцьцявіць толькі пад кіраўніцтвам акупантаў — вонкавых ці ўнутраных… Зь іншага боку, у Расеі ўрад Прымакова зрабіў тое, чаго бясплённа дамагаліся лібэралы: рэзкае скарачэньне расходаў дзяржбюджэту і г.д. Бо асоба Прымакова ўспрымалася большасьцю Думы й грамадзтва ня так, як Чубайса.

**Л.Ушкін**: Гэта праграма нэалібэральных рэформаў для Беларусі. Яна можа быць рэалізаваная толькі пры ўмове сацыяльнага кансэнсусу. Калі яго ня будзе, рэйтынг апазыцыі ў нас будзе вагацца ў межах пяці працэнтаў, як гэта сёньня ў Расеі. Я б не хацеў такога ў нас.



## Дзякуй беларускаму чыноўніцтву

**В.Сіліцкі**: Беларускае грамадзтва сёньня кансэнсусу ня мае ні па адным пытаньні. Можа ня быць кансэнсусу на вартасным узроўні, але ён можа быць на ўзроўні паводзінаў.

Самыя радыкальныя рэформы ажыцьцяўляліся пры найбольш дэмакратычных рэжымах, найбольш нестабільных урадах. Але працэс ішоў, і нейкія перамены былі незваротнымі: кошт павароту быў нашмат большым, чым кошт руху наперад, што ўсьведамлялі эліты. У Вугоршчыне левыя праводзілі ідэю радыкальнай прыватызацыі, дзе ўдзельнічалі толькі замежныя інвэстары: усё толькі за вялікія грошы. Яны тлумачылі: мы можам пайсьці па іншым варыянце, але давядзецца істотна скараціць сацыяльныя выдаткі.

**А.Дынько:** Абсалютнага кансэнсусу быць ня можа. Нават у такім кансалідаваным грамадзтве, як польскае, Самаабарона і Ліга польскіх сем'яў яднаюць радыкальных праціўнікаў эўраінтэграцыі. Калі чакаць кансэнсусу, можна ніколі не распачаць рэформаў.

**В.Булгакаў**: Мушу адзначыць, што пэўныя рэчы, прапісаныя ў гэтай кнізе на ўзроўні праграмы, ужо выконваюцца. Праект рэформы сацыяльнай сфэры зьмяшчае рэчы, якія хоцькі-няхоцькі даводзіцца выконваць цяперашнім урадам: рэформы пэнсійнай сыстэмы, сыстэмы аховы здароўя, жыльлёва-камунальнай гаспадаркі... У Беларусі замарожаная палітычная сыстэма, але з году ў год ідуць зьмены ў эканамічнай, сацыяльнай, адукацыйнай сфэрах. Адбываецца паўзучая лібэралізацыя беларускай эканомікі. Павал Данэйка, які кансультаваў аўтараў эканамічнага блёку кнігі, трымаецца думкі, што беларуская эканоміка цалкам нелібэралізаваная. Але навуковая рэдактарка эканамічнага разьдзелу Рута Вайніене, даведаўшыся пра фактычна свабоднае цэнаўтварэньне й пэўны рынак нерухомасьці ў Беларусі, не ацэньвала цяперашняй эканамічнай палітыкі так адназначна.

Апошнія гады для беларускага грамадзтва не азмрочыліся сацыяльнымі і эканамічнымі катастрофамі не ў апошнюю чаргу дзякуючы беларускаму чыноўніцтву. Яно выступала амартызатарам шокаў і непрадказальных зыгзагаў генэральнай лініі ды забясьпечвала адносную стабільнасьць у краіне.

**У.Мацкевіч**: Ёсьць рэчы, якія ўладзе даводзіцца рабіць незалежна ад таго, што яна пра сябе думае. І праграмы гэтай кніжкі любы ўрад вымушаны будзе рабіць. Але адна справа, калі гэта людзі робяць сьвядома, а другая — калі робяць гэта пад прымусам абставінаў ці нечага



Валер Булгакаў
Анатоль Сідарэвіч
Андрэй Казакевіч
Віталь Сіліцкі
Аляксандар Фядута

# расьцягнуцца на … гадоў

іншага. Сёньняшні ўрад і папярэднія рабілі гэта прымусова, празь «не хачу». Мы павольна рухаемся на Захад, нас туды нясе. Але трэба ўсьведамляць, што калі цябе нясе, дык гэта не рэформы адбываюцца — магчыма, ідзе эвалюцыя. Эвалюцыя — яшчэ не рэформы.

## Ці ёсьць альтэрнатыва эўрапейскаму выбару

**А.Дынько**: Ці ёсьць альтэрнатыва эўрапейскаму выбару?

**А.Фядута**: Альтэрнатывай Усходу заўжды ёсьць Захад. Альтэрнатывай Захаду ёсьць Усход, Поўнач і Поўдзень. У гэтым сэнсе ў нас багаты выбар.

**А.Анціпенка**: Трэба гаварыць пра аптымальны выбар. На маё разуменьне, аптымальны выбар — на Захад.

**У.Мацкевіч**: Думаю, назаўжды вызначыцца з выбарам — на Ўсход ці на Захад — мы ня зможам. І пераконваць у гэтым адзін аднаго няма сэнсу.

**С.Леўшуноў**: А ці ёсьць будучыня ва ўсходняга выбару?

**У.Мацкевіч**: Магчымасьць такога выбару ёсьць. Але пры ім беларусаў няма.

**С.Леўшуноў**: На мой погляд, у нас няма аніякага выбару, акрамя вэстэрнізацыі. Па-за вэстэрнізацыяй нас не існуе.

## Нас ніхто не чакае… калі мы не пераменімся

**В.Булгакаў**: У беларускіх элітаў няма кансэнсусу што да эўрапейскіх вартасьцяў. З выступаў Станіслава Багданкевіча і Ўладзімера Парфяновіча на прэзэнтацыі кнігі 3 лістапада я зразумеў, што для мозгу нашай нацыі «Эўропа» ня ёсьць культурнай вартасьцю. Шмат палітыкаў, у тым ліку апазыцыйных Лукашэнку, думае як Лукашэнка: нас там ніхто не чакае.

**Л.Ушкін**: У якую Эўропу нас клічуць? У Эўропы няма агульнай канстытуцыі. Я — за Эўропу, але што такое гэтая аб'яднаная Эўропа? Гэта толькі міт, што існуе нейкая Эўропа. Гэта абстракцыя.

**А.Сідарэвіч**: Эўропа не абстракцыя. Эўропа — гэта «Хартыя правоў чалавека», гэта Суд па правах чалавека. Ёсьць сацыяльная Эўропа, якая падцягвае адсталыя краіны (Партугалію, Грэцыю, Гішпанію). Ёсьць, нарэшце, Эўрапейская партыя сацыялдэмакратаў, Эўрапейская партыя лібэралаў... Ёсьць сыстэма вартасьцяў, выпрацаваная эўрапейскай цывілізацыяй. На нас цісьне спадчына камунізму, памножаная на праваслаўную культуру. Таму і зьяўляюцца думкі, што нас ніхто не чакае. У 1992 г. Міхась Ткачоў прыехаў з XIX Кангрэсу Інтэрнацыяналу і сказаў тыя ж словы: «Нас там ніхто не чакае». Але дадаў: «Калі мы не пераменімся».

## Амаральныя эліты

**А.Дынько:** Паводле апошніх сацыялягічных апытаньняў, 2/3 беларусаў хацелі б інтэграцыі краіны ў Эўразьвяз. Вялізная частка палітычнае эліты (як з кіраўнічага, так і апазыцыйнага блёкаў) таксама хоча гэтага. Але палітычныя эліты баяцца, што кошт рэформаў будзе занадта вялікі: палітычная сіла, якая будзе праводзіць іх, акажацца выціснутай з палітычнага поля. Што з прапановаў, пададзеных у кнізе, можа выкарыстоўваць цяпер канкрэтны ўрад, нават калі ён будзе баяцца адкрыта дэклараваць рэформы?

**А.Фядута**: Як былы школьны настаўнік, магу сказаць, што можна выкарыстоўваць разьдзел «Адукацыя», і неадкладна, бо мы ўжо спазьняемся. Калі новы міністар гэтым не скарыстаецца, далейшая сытуацыя ў сыстэме адукацыі будзе жудаснай.

Эліты баяцца праводзіць рэформы, бо могуць страціць уладу... Але гэта непазьбежна! Пытаньне «Ці застанёмся мы ўва ўладзе пасьля рэформаў?» — галоўнае, якое задаюць сабе ўсе палітычныя сілы. Гэта амаральнае пытаньне! У нас няма эліты — людзей, згодных несьці адказнасьць за прынятыя рашэньні. Усе беларускія палітыкі, якім я пасьля 2001 г. казаў: «Хлопцы, прайгралі — трэба сыходзіць», — адказвалі: «А хто апрача нас?» Яны не пыталіся: «А што будзе з краінай?»

**У.Мацкевіч**: Адна з элітаў — інтэлектуалы. І калі сёньня інтэлектуалы працягваюць казаць: «У Беларусі няма элітаў», — гэта анахранізм. У нас усё ёсьць, толькі няма «адмашкі», каб пачаць рабіць. Кожная з элітаў адказная за сваё, інтэлектуалы адказныя найперш за словы, што прамаўляюцца. Я хачу адзначыць, што ўпершыню ў палітычным блёку рэформаў зьявілася абмеркаваньне рэформаў у адукацыі. І гэта добра.



**Занатаваў Зьміцер Дзядзенка**
**Фота Арцёма Лявы**

# Караганаў дзівуецца ўзроўню беларускай апазыцыі

**Масква працягвае шантажаваць Лукашэнку. У Радзе па замежнай і абароннай палітыцы адбылася чарговая сустрэча зь лідэрамі беларускай апазыцыі, на гэты раз левае.**

У мінулую пятніцу, 14 лістапада, Маскву наведала дэлегацыя лідэраў беларускіх левых партыяў. Яны былі запрошаныя на «круглы стол» Сяргеем Караганавым, старшынём Рады па замежнай і абароннай палітыцы ды намесьнікам дырэктара Інстытуту Эўропы Расейскай акадэміі навук. Падобныя сустрэчы апошнім часам адбываюцца рэгулярна. У пачатку восені вояж у Маскву зьдзейсьнілі прадстаўнікі АГП і БНФ.

Сустрэча расейскіх аналітыкаў зь беларускімі палітыкамі адбывалася ва ўтульным гатэлі «Срэценскі», стылізаваным пад XV ст., недалёка ад вядомай вуліцы Лубянка. Запрашэньні на ўдзел у «круглым стале» «Ўнутрыпалітычная сытуацыя ў Расеі і Беларусі. Развіцьцё расейска-беларускіх адносінаў на шляху збліжэньня з Эўропай» прынялі Станіслаў Шушкевіч, Сяргей Калякін, Аляксандар Бухвостаў, Аляксей Кароль, а таксама Натальля Машэрава. Апошняя прысутнічала ў якасьці сябра парлямэнцкага сходу Беларусі і Расеі, у кампаніі апазыцыянэраў яна не адчувала дыскамфорту і ў дыскусіі не ўступала. Паводле нашай інфармацыі, запрашэньне меў і Мікола Статкевіч, але ў Маскву не паехаў.

Як сказаў лідэр ПКБ Сяргей Калякін, з расейскага боку ў «круглым стале» ўдзельнічалі «кіраўнікі ўплывовых аналітычных цэнтраў, якія абслугоўваюць кіраўніцтва Расеі». Акрамя Сяргея Караганава прысутнічалі Яўген Кажокін, дырэктар Расейскага інстытуту стратэгічных дасьледаваньняў, Уладзімер Раманенка, намесьнік дырэктара Інстытуту краінаў СНД, Ільля Панамароў, кіраўнік інфармацыйна-тэхнічнага цэнтру пры ЦК КПРФ, Ігар Царык, экспэрт-аналітык, які прадстаўляў аналітычную дырэкцыю 1-га тэлеканалу, і інш.

Ва ўступным слове Караганаў сказаў, што «нашы прапановы і інфармацыя будуць перададзеныя кіраўніцтву Расеі». Такі пачатак задаў тон усяму «кругламу сталу». У размове з карэспандэнтам «НН» Станіслаў Шушкевіч прыгадаў, што расейскія аналітыкі «пасыпалі свае галовы попелам», прызнаючы ранейшыя памылкі і пралікі: «Мы думалі, што ваш галоўны можа стаць беларускім Дэн Сяапінам, але потым зразумелі, што гэта далёка ня так. Зразумелі, што Беларусь ідзе ў «трэці сьвет», а можа, і ў «чацьверты». І зьмяніць сытуацыю немагчыма...» Давялося расейцам выслухаць у свой адрас і крытыку з боку беларускіх гасьцей. С.Шушкевіч прыгадаў ранейшае стаўленьне «канторы» Караганава да незалежнасьці Беларусі і апазыцыйных сілаў. Арганізатару мерапрыемства давялося апраўдвацца, што часы зьмяніліся, а зь імі зьмяніліся іх пазыцыі і стаўленьні…

Расейскі бок маляваў невясёлыя перспэктывы беларуска-расейскіх адносінаў. Яны канстатавалі зьніжэньне інтарэсу Расеі да Беларусі, які ўжо саступае інтарэсу да Ўкраіны або дзяржаваў Балтыі. Зьяўленьне новых шляхоў транзыту энэргаэсурсаў на Захад, у абыход Беларусі, будзе толькі спрыяць гэтаму працэсу. Падчас «круглага стала» неаднойчы ўздымалася тэма дачыненьняў з аб'яднанай Эўропай. «Беларусь аддалілася ад Эўропы і аддаляецца ад Расеі», — прызналі расейцы. Аляксей Кароль кажа, што расейскія аналітыкі наагул паставілі пад сумнеў ідэю саюзнай дзяржавы, якая «зусім вычарпала сябе».

Сяргей Караганаў акрэсьліў асноўныя пазыцыі расейскага боку ў «беларускім пытаньні». Маўляў, Расея адназначна заяўляе, што хацела б бачыць Беларусь рынкавай, дэмакратычнай дзяржавай, у якой праходзілі б палітычныя і эканамічныя рэформы. Тады як «эканамічная падтрымка Расеі вядзе да замарожваньня і пагаршэньня сытуацыі ў Беларусі». Таму варта чакаць, што падтрымка такая можа спыніцца. Усе ўдзельнікі «круглага стала» з расейскага боку катэгарычна выступілі супраць магчымага трэцяга тэрміну прэзыдэнцтва Лукашэнкі. «Гэта будзе трагедыя і для таго, хто хоча на яго пайсьці, і для краіны», — казаў С.Караганаў. І апошняе, што адзначалі расейцы, — гэта сваё зьдзіўленьне «высокім узроўнем беларускай апазыцыі» і яе «ідэалягічным адзінствам».

Паводле інфармацыі «НН», Рада Караганава будзе працягваць сустрэчы з апазыцыяй. У найбліжэйшы час у Маскве плянуецца правесьці канфэрэнцыю з прадстаўнікамі беларускіх моладзевых арганізацыяў. «У Расеі цяпер ідзе інтэнсіўная прапрацоўка пытаньня, што рабіць далей у дачыненьнях зь Беларусяй, — кажа ўдзельнік маскоўскай сустрэчы А.Бухвостаў. — Расея расчаравалася ў палітычнай сытуацыі і ня верыць, што Лукашэнка можа правесьці дэмакратычныя рэформы. Таму шукаюцца варыянты».

Сам Караганаў заявіў беларускім палітыкам літаральна наступнае: «Мы ня хочам зьвяржэньняў, катаклізмаў, але мы гатовыя абмяркоўваць гэтыя варыянты». А яшчэ арганізатары казалі, што, хоць Расея і можа абысьціся без Беларусі, «хворы сусед» пад бокам — зьява небясьпечная.

**Сяргей Ёрш**

# 24 лістапада панядзелак

### ● БТ
7.00, 8.00, 9.00, 10.00, 11.00, 12.00, 13.00, 14.00, 15.00, 16.00, 17.00, 18.00, 19.00, 23.00 Навіны.
7.05, 8.10 «Добрай раніцы, Беларусь!».
9.05 «У цэнтры ўвагі».
10.05 «36,6».
10.35 Падарожжа дылетанта. «Вёска Вязынь. Вязынская медавуха».
11.05 «Шпілька».
11.35 «Сузор'е надзей». Нацыянальны тэлевізійны конкурс юных талентаў.
12.10 Спэцыяльны рэпартаж. «Над прорвай у мане. Бяздонныя банкі». Частка 2-я.
12.25 Камэдыя «Ўдар па сыстэме».
14.05 «Ваша лята».
14.45 «Мая краіна».
15.10 Сэрыял «Амазонка».
16.05 «Кліп-абойма». Вынікі хіт-параду.
17.05 «Між іншым...»
18.10 Сэрыял «Нож у аблоках».
19.05 Зона Ікс.
19.25 Камэдыя «Ляўшун».
21.00 «Панарама». Інфармацыйны канал.
21.40 Дэтэктыў «Прызнаньне камісара паліцыі пракурору рэспублікі».
23.30 «Час спорту».
23.55 «Дастань зорку».

### ● ЛАД
7.0. 14.00, 20.00 Навіны.
7.10 «Мышаня-хвалько», «Урокі цётухны Савы. Азбука-малышка». Мультфільмы.
7.25 Дак. фільм «Смургонскія хронікі».
8.05, 22.10 Сэрыял «Пецярбурскія тайны».
9.00 «Сад мары».
9.30 Наша спадчына. «Мястэчка Воўчын. Радзіма апошняга польскага караля Станіслава Аўгуста Панятоўскага». Частка 1-я.
9.40 «Тэлебаромэтар».
10.00 «Паміж намі, жанчынамі».
10.20, 21.15 Сэрыял «Прыгоды Шэрлака Холмза».
11.15, 13.10 «Звычайны незвычайны дзень».
11.50 Камэдыя «Антон Іванавіч сярдуе».
13.35 «Як адзін мужык двух генэралаў пракарміў». Мультфільм.
14.10 Любімыя казкі. «Вераніка».
15.35 «Урокі цётухны Савы. Арытмэтыка-малышка». Мультфільм.
15.45 «Не зявай!».
15.55 «Бум».
16.25 Камэдыя «Варатар».
17.40 Маст. фільм «Аплядысмэнты, аплядысмэнты».
19.00 Футбол. Чэмпіянат Італіі. Дзёньнік тура.
20.15 Калыханка.
20.30 «Справы сямейныя».

### ● СТВ
6.25, 15.25 «Паўэр рэйнджэрз, ці Магутныя рэйнджэры». Тэлесэрыял.
6.50 «Трансформэры». Мультсэрыял.
7.30 «168 гадзін».
8.20 «Менск і менчукі».
8.30, 23.20 «Тэхналёгія».
8.40 Кіно: камэдыя «Зьнішчальнікі прывідаў-2».
10.25 «Асабісты інтэрас».
11.00 «Анфас».
11.15 «Тэлеафіша».
11.25 «Дзікая плянэта»: «Новыя запаведнікі». Дак. фільм.
12.00 «Сапраўднае каханьне».
12.55 «Дыялёг з усім сьветам»: «Забароненае каралеўства». Дак. фільм.
13.30, 16.30, 19.30, 23.00 «24 гадзіны».
13.55, 18.30 «NEXT-3». Тэлесэрыял.
15.00 «Супэршоў братоў Марыё». Мультсэрыял.
15.50 «Маска». Мультсэрыял.
16.15 «Турпаход».
16.50 Камэдыя «Ўльтыматум».
18.05 «Меншчына. Людзі, падзеі, факты».
18.15 «Арт-экспрэс». Культурнае жыцьцё сталіцы.
20.00 «СТВ-спорт».
20.25 «Добры вечар, маленькі...».
20.40 «Кадравае пытаньне».
20.50 «Запрашаем паскардзіцца...».
21.00 Трылер «Два дні ў даліне».
23.30 «Сталічны футбол зь Юрыем Пунтусам».
23.55 «Навіны СНД».
0.15 Кіно: фільм жахаў «Павукі-2».
1.50 «Вялікая музыка».

### ● АНТ
8.00, 9.00, 18.00, 20.30, 23.00 Нашы навіны.
8.05 Тэлеканал «Добрай раніцы».
9.05 Контуры.
9.50 Камэдыя «Ўтаймаваньне наравістай».
11.55 Сьледзтва вядзе Калабкоў.
14.45 «Горад жанчын».
15.35, 23.20 «Фабрыка зорак-3».
15.55 «Угадай мэлёдыю».
16.20 Сэрыял «Бераг мары».
17.05 «Вялікае мыцьцё».
18.15 Чакай мяне.
19.10 «Зямля каханьня, зямля надзеі».
20.00 Час.
21.05 Ток-шоў «Выбар».
21.50 Баявік «Радзіма чакае».
23.40 Сакрэтнае дасье. «Чырвоная Мата Хары».

### ● РТР
7.45 Маст. фільм «Вясельле».
9.50 «У Гарадку».
10.00, 19.00 Весткі.
18.00 Выбары-2003.
19.30 Мясцовы час. Весткі — Масква.
19.50 Дабранач, дзеці!
19.55 Сэрыял «Лініі лёсу».
21.00 Сэрыял «Апэратыўны псэўданім».
22.00 Весткі+.
22.20 «Мой срэбраны. Сымона Сіньёрэ».
23.15 Народны артыст.

### ● НТВ
9.00 Сёньня раніцай.
9.20 Надвор'е на заўтра.
9.25 «Надоечы» зь Леанідам Парфёнавым.
11.00, 16.00 «Сёньня» з Кірылам Паздняковым.
14.35 Ток-шоў «Прынцып даміно».
16.30 Сэрыял «Яна напісала забойства».
17.35 «Увага: вышук!».
18.00 «Сёньня» з Тацянай Мітковай.
18.35 Сэрыял «Агенцтва «Залатая куля». Справа белай стралы».
19.45 Сэрыял «Чорны крумкач-2».
21.00 «Краіна і сьвет».
21.35 Чырвоная страла.
21.50 Сэрыял «Кліент заўсёды мёртвы».

### ● Эўраспорт
9.30 Горныя лыжы. Кубак сьвету. Парксыты. Мужчыны. Паўтор.
10.30, 1.45 Алімпійскі часопіс. Паўтор.
11.00 Снукер. Чэмпіянат Вялікабрытаніі. Ёрк. Паўтор.
12.30, 23.15 Футбол. Кубак УЭФА.
14.00 Цяжкая атлетыка. Чэмпіянат сьвету. Канада. Спэцагляд.
16.00 Снукер. Чэмпіянат Вялікабрытаніі. Ёрк. Жывая трансьляцыя.
19.30 «Эўрагалы». Футбольны часопіс.
20.30 Футбол. Кубак УЭФА. Паўтор.
22.00 К-1. Легенды.
0.15 «Эўрагалы». Футбольны часопіс. Паўтор.

# 25 лістапада аўторак

### ● БТ
7.00, 8.00, 9.00, 10.00, 11.00, 12.00, 13.00, 14.00, 15.00, 16.00, 17.00, 18.00, 19.00, 23.00 Навіны.
7.05, 8.10 «Добрай раніцы, Беларусь!».
8.45, 14.45, 16.45, 19.10, 23.45 «Мая краіна».
9.05 Сэрыял «Салямэя».
10.10, 17.10 Сэрыял «Тайны чатырох злачынстваў». «Тайны аднаго двара».
11.10, 18.10 Сэрыял «Нож у аблоках».
12.10 Зона Ікс.
12.25 Камэдыя «Ляўшун».
14.05 «Усё нармальна, мама!».
15.10 «Час спорту».
15.35 «Маскі-шоў».
16.05 «5х5».
19.25 Футбол. Ліга чэмпіёнаў. «Лякаматыў» (Масква) — «Дынама» (Кіеў). Жывая трансьляцыя з Масквы.
21.30 «Панарама». Інфармацыйны канал.
22.10 Камэдыя «Папугай, які размаўляе на ідыш» (Расея—Германія).
0.15 Футбол. Дзёньнік Лігі чэмпіёнаў.

### ● ЛАД
7.00, 14.00, 20.00 Навіны.
7.10 «Казка пра стары кедар». Мультфільм.
7.30 Мультсэрыял «Вакол шпіёны».
7.50 «Настаўніцкая».
8.05, 22.15 Сэрыял «Пецярбурскія тайны».
9.00 «Правінцыйныя гісторыі».
9.30 «Імгненьне вечнасьці».
9.50 «Іншыя танцы».
10.00 «Паміж намі, жанчынамі».
10.20, 21.15 Сэрыял «Прыгоды Шэрлака Холмза».
11.15, 13.05 «Звычайны незвычайны дзень».
11.50 Маст. фільм «Аплядысмэнты, аплядысмэнты».
13.30 «Апошняя нявеста Зьмея Гарынача», «Воўк і цяля». Мультфільмы.
14.10, 15.45 «Не зявай!».
14.50 «Казка пра рыбака і рыбку». Мультфільм.
15.20 Сэрыял «Сабачае жыцьцё».
15.55 «Бум».
16.25 Сэрыял «Рынкі сьвету».
16.50 «Росчырк часу».
17.00 «Варыяцыі на балетныя тэмы».
17.35 «Настальжы».
18.00 Дак. фільм «П'едэстал. Амплітуда Рэнальда Кныша».
18.30 Маст. фільм «Атлянты і карыятыды».
20.15 Калыханка.
20.30 «Справы сямейныя».

### ● СТВ
6.25 «Паўэр рэйнджэрз, ці Магутныя рэйнджэры». Тэлесэрыял.
6.50 «Трансформэры». Мультсэрыял.
7.20, 18.05 «Меншчына. Людзі, падзеі, факты».
7.30, 16.30, 19.30, 22.45 «24 гадзіны».
7.50, 23.05 «Тэхналёгія».
16.00, 20.00 «СТВ-спорт».
16.20 «Кадравае пытаньне».
16.55 «Сталічны футбол зь Юрыем Пунтусам».
17.20 «Пакуль гарыць сьвечка...».
18.15 «Добры дзень, доктар!».
18.30 «NEXT-3». Тэлесэрыял.
20.15 «Тэма дня».
20.25 «Добры вечар, маленькі...».
20.40 «Закон і крымінал».
20.55 Кіно: баявік «Гульня ў забойства».
23.15 «Гарачы лёд».
23.40 «Навіны СНД».
0.00 Кіно: маст. фільм «Галава Гаргоны».

### ● АНТ
16.20 Сэрыял «Бераг мары».
17.05 «Вялікае мыцьцё».
18.00, 20.30, 23.25 Нашы навіны.
18.15 Ток-шоў «Вокны».
19.05 «Зямля каханьня, зямля надзеі».
20.00 Час.
21.05 Сэрыял «Ніна».
22.15 Баявік «Радзіма чакае».
23.45 «Ня толькі пра футбол».
0.10 «Фабрыка зорак-3».
0.30 «На футболе».

### ● РТР
7.45, 19.55 Сэрыял «Лініі лёсу».
8.45 Сьвята Ўраза-Байрам. Трансьляцыя з Маскоўскага саборнага мячэту.
9.45 Весткі. Дзяжурная часьць.
10.00, 19.00 Весткі.
18.00 Выбары-2003.
19.30 Мясцовы час. Весткі — Масква.
19.50 Дабранач, дзеці!
21.00 Сэрыял «Апэратыўны псэўданім».
22.00 Весткі+.
22.20 Прэм'ера. «Тэгеранскі лябірынт: Сталін, Чэрчыль, Рузвэльт». 1-я сэрыя.
23.15 Народны артыст.

### ● НТВ
9.00 Сёньня раніцай.
9.20 Надвор'е на заўтра.
9.25 «Іх норавы».
10.15 Ток-шоў «Краіна парад».
11.00, 16.00 «Сёньня» з Кірылам Паздняковым.
14.35 Ток-шоў «Прынцып даміно».
16.30 Сэрыял «Яна напісала забойства».
17.35 Тэрыторыя выжываньня.
18.00 «Сёньня» з Тацянай Мітковай.
18.25 Сэрыял «Агенцтва «Залатая куля». Справа дзьвюх жанчын».
21.35 «Краіна і сьвет».
22.05 Чырвоная страла.
22.20 Сэрыял «Кліент заўсёды мёртвы».

### ● Эўраспорт
9.30, 13.30, 15.00, 20.00 Футбол. Кубак УЭФА. Паўтор.
11.00, 0.45 Снукер. Чэмпіянат Вялікабрытаніі. Ёрк.
12.30, 19.00 «Эўрагалы». Футбольны часопіс. Паўтор.
16.00 Снукер. Чэмпіянат Вялікабрытаніі. Ёрк. Жывая трансьляцыя.
21.00 Бокс. ТВА.
22.00 Бокс. ТВА. Жывая трансьляцыя.
0.00 Алімпійскі часопіс.

# 26 лістапада серада

### ● БТ
7.00, 8.00, 9.00, 10.00, 11.00, 12.00, 13.00, 14.00, 15.00, 16.00, 17.00, 18.00, 19.00 Навіны.
7.05, 8.10 «Добрай раніцы, Беларусь!».
9.05 Сэрыял «Салямэя».
10.05, 17.05 Сэрыял «Тайны чатырох злачынстваў». «Тайны аднаго двара».
11.10, 18.15 Сэрыял «Нож у аблоках».
12.10 Камэдыя «Маленькая падманшчыца».
14.05 Тэлегульня «Аднаклясьнікі».
14.45 «Мая краіна».
15.10 Сэрыял «Амазонка».
16.05 «5х5».
19.05 Мэлядрама «Спадар афармляльнік».
21.00 «Панарама». Інфармацыйны канал.
21.40 Футбол. Ліга чэмпіёнаў. «Штутгарт» (Нямеччына) — «Глазга Рэйнджэрз» (Шатляндыя). Жывая трансьляцыя зь Нямеччыны. У перапынку — Навіны.
23.40 «Чэмпіёны. Юлія Раскіна».
23.55 «Кліп-абойма».
0.10 Футбол. Дзёньнік Лігі чэмпіёнаў.

### ● ЛАД
7.00, 14.00, 20.00 Навіны.
7.10 «Кубік і Тобік», «Карантыш — зялёныя штонікі». Мультфільмы.
7.30 Мультсэрыял «Вакол шпіёны».
7.55 «Эх, показка, показка».
8.05, 22.15 Сэрыял «Пецярбурскія тайны».
9.00 Плошча мастацтваў.
9.30 «Ёсьць толькі міг...».
10.00 «Паміж намі, жанчынамі».
10.20, 21.15 Сэрыял «Прыгоды Шэрлака Холмза».
11.15, 13.20 «Звычайны незвычайны дзень».
11.50, 18.30 Маст. фільм «Атлянты і карыятыды».
13.45 «Дом, які збудаваў Джэк», «Урокі цётухны Савы. Азбука-малышка». Мультфільмы.
14.10 Мультыклюб.
15.05 Сэрыял «Сабачае жыцьцё».
15.25 «Гарачы камень». Мультфільм.
15.45 «Не зявай!».
15.55 «Бум».
16.25 Маст. фільм «Аляксандар Неўскі».
18.15 «Іван Ахрэмчык у часе». Дак. фільм.
20.15 Калыханка.
20.30 «Справы сямейныя».

### ● СТВ
6.25, 15.25 «Паўэр рэйнджэрз, ці Магутныя рэйнджэры». Тэлесэрыял.
6.50 «Трансформэры». Мультсэрыял.
7.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.45 «24 гадзіны».
7.50, 20.00 «СТВ-спорт».
8.05, 18.05 «Меншчына. Людзі, падзеі, факты».
8.15, 20.15 «Менск і менчукі».
8.25, 23.05 «Тэхналёгія».
8.40 Кіно: баявік «Гульня ў забойства».
10.20, 20.40 «Аўтапанарама».
10.40 «Гарачы лёд».
11.00 «Закон і крымінал».
11.15, 12.00 «Сапраўднае каханьне».
12.55 «Такая прафэсія».
13.55, 18.30 «NEXT-3». Тэлесэрыял.
15.00 «Супэршоў братоў Марыё». Мультсэрыял.
15.50 «Маска». Мультсэрыял.
16.20 «Тэма дня».
16.50 Кіно: дэтэктыў «Калье Шарлоты».
18.15 «Плянэта людзей».
20.25 «Добры вечар, маленькі...».
20.55 Кіно: баявік «Мёртвая хватка».
23.15 «Навіны СНД».
23.35 «Праект «Адлюстраваньне»: «Індыйская абарона». Дак. фільм.
0.05 «Ілюзіён»: камэдыя «Ніначка».

### ● АНТ
8.00, 9.00, 18.00, 20.30, 23.25 Нашы навіны.
8.05 Тэлеканал «Добрай раніцы».
9.05, 19.05 «Зямля каханьня, зямля надзеі».
10.30 «Ня толькі пра футбол».
10.50 Дыснэй-клюб: «Баз і яго каманда».
14.50 «Горад жанчын».
15.35, 23.45 «Фабрыка зорак-3».
15.55 «Угадай мэлёдыю».
16.20 Сэрыял «Бераг мары».
17.05 «Вялікае мыцьцё».
18.15 Ток-шоў «Вокны».
20.00 Час.
21.05 Сэрыял «Ніна».
22.15 Баявік «Радзіма чакае».
0.05 «Форганг».

### ● РТР
7.45, 19.55 Сэрыял «Лініі лёсу».
8.45 Сам сабе рэжысэр.
9.45 Весткі. Дзяжурная часьць.
10.00, 19.00 Весткі.
18.00 Выбары-2003.
19.30 Мясцовы час. Весткі — Масква.
19.50 Дабранач, дзеці!
21.00 Сэрыял «Апэратыўны псэўданім».
22.00 Весткі+.
22.20 Прэм'ера. «Тэгеранскі лябірынт: Сталін, Чэрчыль, Рузвэльт». 2-я сэрыя.
23.15 Народны артыст.

### ● НТВ
9.00 Сёньня раніцай.
9.20 Надвор'е на заўтра.
9.25 Кулінарны паядынак.
10.15 Ток-шоў «Краіна парад».
11.00, 16.00 «Сёньня» з Кірылам Паздняковым.
14.35 Ток-шоў «Прынцып даміно».
16.30 Сэрыял «Яна напісала забойства».
17.35 Шчырае прызнаньне.
18.00 «Сёньня» з Тацянай Мітковай.
18.35 Сэрыял «Агенцтва «Залатая куля». Справа ўваскрэслага мерцьвяка».
19.45 Сэрыял «Чорны крумкач-2».
21.00 «Краіна і сьвет».
21.35 Чырвоная страла.
21.50 Сэрыял «Кліент заўсёды мёртвы».

### ● Эўраспорт
9.30, 10.00 Экстрэмальныя віды спорту. Паўтор.
10.30 «Эўрагалы». Футбольны часопіс. Паўтор.
11.30 Алімпійскі часопіс. Паўтор.
12.00, 16.00, 21.00 Снукер. Чэмпіянат Вялікабрытаніі. Ёрк. Паўтор.
14.00 Бокс. Паўтор.
19.00 Цяжкая атлетыка. Чэмпіянат сьвету. Канада. Паўтор.
0.15 Конны спорт.
1.15 Бокс. Паўтор.

# 27 лістапада чацьвер

### ● БТ
7.00, 8.00, 9.00, 10.00, 11.00, 12.00, 13.00, 14.00, 15.00, 16.00, 17.00, 18.00, 19.00, 23.00 Навіны.
7.05, 8.10 «Добрай раніцы, Беларусь!».
8.45, 16.45, 20.45, 23.25 «Мая краіна».
9.05 Сэрыял «Салямэя».
10.10, 17.05 Сэрыял «Тайны чатырох злачынстваў». «Пахаваньне замест вясельля».
11.10, 18.10 Сэрыял «Нож у аблоках».
12.20 Мэлядрама «Спадар афармляльнік».
14.15 «Кропка».
15.10 Сэрыял «Амазонка».
16.05 «5х5».
19.10 Баявік «Шанхайскі сувязны».
21.00 «Панарама». Інфармацыйны канал.
21.40 Дэтэктыў «Рыкашэт».
23.40 «Кліп-абойма».
23.50 «Новая калекцыя» Алега Лукашэвіча.

### ● ЛАД
7.00, 14.00, 20.00 Навіны.
7.10 «Сын каменя», «Фарбаваны ліс». Мультфільмы.
7.40 «Бюро знаходак».
8.5. 22.15 Сэрыял «Пецярбурскія тайны».
9.00 «Плошча мастацтваў».
9.30 «Здароўе».
10.00 «Паміж намі, жанчынамі».
10.20, 21.15 Сэрыял «Прыгоды Шэрлака Холмза».
11.15, 13.20 «Звычайны незвычайны дзень».
11.50, 18.25 Маст. фільм «Атлянты і карыятыды».
13.45 «Жыў-быў сабака», «Урокі цётухны Савы. Азбука-малышка». Мультфільмы.
14.10 Мультыклюб.
15.05 Сэрыял «Сабачае жыцьцё».
15.25 «Каваль-чараўнік». Мультфільм.
15.45 «Не зявай!».
15.55 «Бум».
16.25 «Калі ж пойдзе сьнег». Тэлеспэктакль.
17.25 Відэафільм «Восень».
17.30 Спэктакль Нацыянальнага тэатру опэры і балету «Карміна Бурана».
20.15 Калыханка.
20.30 «Справы сямейныя».

### ● СТВ
6.25 «Паўэр рэйнджэрз, ці Магутныя рэйнджэры». Тэлесэрыял.
6.50 «Трансформэры». Мультсэрыял.
7.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.45 «24 гадзіны».
7.50, 20.00 «СТВ-спорт».
8.05, 18.05 «Меншчына. Людзі, падзеі, факты».
8.25, 23.05 «Тэхналёгія».
8.40 Кіно: баявік «Мёртвая хватка».
10.05 «Лёсу свайго гаспадыня».
10.25, 20.40 «Фільм, фільм, фільм».
10.40 «Партрэт у інтэр'еры».
10.55 «Праект «Адлюстраваньне»: «Індыйская абарона». Дак. фільм.
11.25 «Дзікая плянэта»: «Новыя запаведнікі». Дак. фільм.
12.00 «Сапраўднае каханьне».
12.55 «Усё для цябе».
13.55, 18.30 «NEXT-3». Тэлесэрыял.
15.00 «Супэршоў братоў Марыё». Мультсэрыял.
15.50 «Маска». Мультсэрыял.
16.15 «Запрашаем паскардзіцца...».
16.50 Кіно: дэтэктыў «Калье Шарлоты».
18.15 «Тэатральныя гісторыі».
20.15 «Тэма дня».
20.25 «Добры вечар, маленькі...».
20.55 Кіно: баявік «Небясьпечныя асобіны».
23.15 «Навіны СНД».
23.30 «Навіны сусьветнай шоў-індустрыі».
0.20 Кіно: трылер «У сецявіне парнабізнэсу».

### ● АНТ
8.00, 9.00, 18.00, 20.30, 23.25 Нашы навіны.
8.05 Тэлеканал «Добрай раніцы».
9.5. 19.05 «Зямля каханьня, зямля надзеі».
9.45 Дэтэктыў «Паўторны прагляд».
11.00 Дыснэй-клюб: «Цуды на віражах».
14.45 «Горад жанчын».
15.35, 23.45 «Фабрыка зорак-3».
15.55 «Угадай мэлёдыю».
16.20 Сэрыял «Бераг мары».
17.05 «Вялікае мыцьцё».
18.15 Ток-шоў «Вокны».
20.00 Час.
21.05 Сэрыял «Ніна». Заключная сэрыя.
22.15 Баявік «Радзіма чакае».
0.05 «Чалавек і закон».

### ● РТР
7.45, 19.55 Сэрыял «Лініі лёсу».
8.45 Пакой сьмеху.
9.45 Весткі. Дзяжурная часьць.
10.00, 19.00 Весткі.
18.00 Выбары-2003.
19.30 Мясцовы час. Весткі — Масква.
19.50 Дабранач, дзеці!
21.00 Сэрыял «Апэратыўны псэўданім».
22.00 Весткі+.
22.20 «Гістарычныя хронікі». «1909. Азеф».
23.15 Народны артыст.

### ● НТВ
9.00 Сёньня раніцай.
9.20 Надвор'е на заўтра.
9.25 Кватэрнае пытаньне.
10.15 Ток-шоў «Краіна парад».
11.00, 16.00 «Сёньня» з Кірылам Паздняковым.
14.35 Ток-шоў «Прынцып даміно».
16.30 Сэрыял «Яна напісала забойства».
17.35 «Прафэсія — рэпартэр».
18.00 «Сёньня» з Тацянай Мітковай.
18.35 Сэрыял «Агенцтва «Залатая куля». Справа бронзавага вершніка».
19.45 Сэрыял «Чорны крумкач-2».
21.00 «Краіна і сьвет».
21.35 Чырвоная страла.
21.50 «Да бар'еру!».
23.05 «БГ. Першая паўсотня».

### ● Эўраспорт
9.30 Алімпійскі часопіс. Паўтор.
10.00 Цяжкая атлетыка. Чэмпіянат сьвету. Канада. Паўтор.
12.00 Снукер. Чэмпіянат Вялікабрытаніі. Ёрк. Паўтор.
14.00, 20.00 Бокс. Паўтор.
16.00 Снукер. Чэмпіянат Вялікабрытаніі. Ёрк. Жывая трансьляцыя.
19.00 Скачкі на лыжах з трампліну. Кубак сьвету. Кваліфікацыя. Жывая трансьляцыя.
21.00 Снукер. Чэмпіянат Вялікабрытаніі. Ёрк. Жывая трансьляцыя.
23.45 Футбол. Кубак УЭФА. Спэцагляд.
1.00 Футбол. Кубак УЭФА. Клясык.

НА ПЕРШЫ ПОГЛЯД

# У чаканьні братаньня



Ёсьць жа два пункты погляду: мой і няправільны. А свабода слова — усяго толькі зброя для дасягненьня мэты.

Некалі адзін чалавек параўнаў эміграцыю з «тым сьветам». Тыя, хто туды патрапіў, назад ніколі не вяртаюцца, і мы тут нічога пра іхнае тамтэйшае жыцьцё ня ведаем. Шанцаў сустрэцца з тымі, хто паехаў за мяжу, ня болей, чымся ўбачыць прывід. Зробленае гэтае параўнаньне было, зразумела, за савецкім часам, калі яшчэ існавала «жалезная заслона».

Параўнаньне, трэба сказаць, мне тады здавалася перабольшаньнем. А пасьля таго, як жалезная заслона ператварылася — ну, скажам так, у аксамітную, развагі пра «той сьвет» увогуле сталі ўяўляцца сьмешнымі. Зямная куля ж сапраўды малая: некалькі гадзінаў лёту — і ты ў якой заўгодна з эўрапейскіх сталіцаў. Што ўжо казаць пра краіны, якія раней замежнымі не лічыліся і куды за некалькі гадзінаў можна даехаць аўтобусам.

Паспытаць горкага хлебу эміграцыі не давялося, але давялося жыць і працаваць некаторы час удалечыні ад дому. І вось што дзіўна: вярнуўшыся дахаты, пачаў разумець, што ў параўнаньні з «тым сьветам» ёсьць, аказваецца, рацыя! Калі чалавек зьнікае, гэты факт заўважаюць толькі сваякі і блізкія сябры. Як сьпявалася ў адной савецкай песьні: «отряд не заметил потери бойца…». Людзі жывуць, як акторы тэатру, у абставінах Тут і Цяпер. І калі ў цябе была хоць маленечкая роля, нават бяз словаў, тваё існаваньне прымалі й мірыліся зь ім, бо ёсьць правілы гульні. А калі ты нейкі час адсутнічаў, цябе ўспрымаюць у найлепшым выпадку як безьбілетніка, які патрапіў у глядзельную залю, а то й на сцэну проста з вуліцы.

Масьціты палітык з іранічнай усьмешкай на твары пацепваў па плячы: пажыві тут, паназірай, патусуйся... Хутка зразумееш, што трэба рабіць, з кім варта мець справу, а з кім не, пра што трэба гаварыць, а пра што лепей прамаўчаць, пра што можна думаць, а пра што нельга й насьмельвацца. Усе ролі разьмеркаваныя: вось анёлы, вось казьлішчы. А хто ня з намі — той супраць нас. Амінь!

Я наўмысна ўтрырую. Няма ў прыродзе такіх палітыкаў. Яны ў нас выкшталцоныя, па плячы пацепваюць далікатна і толькі з найлепшых пачуцьцяў, каб падбадзёрыць нашага брата-журналіста. Ну і, канечне, каб падказаць, дзе белае і дзе чорнае. Свабода слова, ці свабода думкі, свабода сумленьня, як усьвядомілі некаторыя нашыя палітыкі, ня маюць самастойнае каштоўнасьці. Важна, чыё гэта слова, чые думкі, чыё сумленьне... Ёсьць жа два пункты погляду: мой і няправільны. А свабода слова — усяго толькі зброя для дасягненьня мэты. Напрыклад, гэтую свабоду можна выкарыстаць, каб давесьці Захаду, што свабоды слова ў тваёй краіне ня толькі няма, але яна не патрэбная і нават шкодная для грамадзтва, бо яно шчэ не сасьпела для рэвалюцыі. Стары кітайскі лёзунг «Хай расьцьвітаюць сто кветак» можна перайначыць на «Хай зачыняюць сто газэт»! Чым менш свабоды — тым лепш. Замежжа нам дапаможа.

Я далёкі ад таго, каб іронію, сарказм узводзіць у ранг пазыцыі. Гэта ўсяго толькі асабісты погляд. Погляд чалавека, які вярнуўся ў холад. Магчыма, працэс здраньцвеньня на марозе пойдзе хутка, і неўзабаве давядзецца тупа паўтараць усьлед за іншымі: дыктатура — гэта кепска, незалежнасьць — гэта добра, Беларусь — у Эўропу, беларуская мова гіне. Адзін з маіх калегаў з гэтага алягічнага набору ісьцінаў здолеў вывесьці лягічную выснову: трэба ісьці на супрацоўніцтва з уладамі, бо трэба рабіць супольную справу — ратаваць Беларусь. Як быццам ва ўладных кабінэтах толькі й чакаюць, калі туды прыйдуць шчырыя й сумленныя палітыкі, аналітыкі, публіцысты — барацьбіты за Беларушчыну. Здаецца, яшчэ крышачку, і пачнецца публічнае братаньне ўладаў з інтэлігенцыяй! Прыклад «братаньня» паміж кіраўніком дзяржавы і беларускімі журналістамі мы маглі бачыць нядаўна ў «Свабодзе слова» Савіка Шустэра.

«Усе людзі — ворагі» і «ўсе мы — беларусы». На першы погляд, гэта дыямэтральна процілеглыя падыходы. Але ёсьць у іх і нешта супольнае. Гэтыя погляды, як мне здаецца, спароджаныя стомленасьцю і адчаем. Прыхільнікі першага лёзунгу спаняверыліся ў магчымасьці змагацца з дыктатурай мірнымі мэтадамі, прынамсі — у дасяжнасьці мэты яшчэ пры ўласным жыцьці, калі можна скарыстацца плёнам перамогі. Прыхільнікі «братаньня», наадварот, як бы пакінулі Беларусь далёка ззаду, апярэдзіўшы ў думках і памкненьнях дзень сёньняшні — такі непрывабны й шэры.

У сёньняшняй Беларусі афіцыйным сьвяточным днём застаецца 7 лістапада — дзень кастрычніцкага перавароту. Бальшавікі, уласна, нічога кепскага не хацелі. Яны хацелі скінуць тырана і ўсталяваць усеагульныя роўнасьць і братэрства. Дзеля дасягненьня мары трэба было ўсяго толькі часова абмежаваць свабоду купкі інтэлігентаў, якія былі з гэтым нязгодныя. Калі казаць моваю таго часу, нязгодных трэ было скінуць з «параходу сучаснасьці». Параход той даўно патануў і заржавеў. А аматары скідваць засталіся.

**Віталь Тарас**

# Я ўратаваў «Пагоню»

**Трэба мне было зайсьці неяк у адну сталічную школу, што знаходзіцца ў Серабранцы.** Падыходжу да ўваходу і раптам бачу, як нейкі дзядок цягне на сьпіне нешта цяжкае. Дзядок маленькі, а яго ноша вялікая. Прайшоў побач са мною. Мне ўнутраны голас кажа, што гэта нешта каштоўнае. Але я пайшоў далей. Памыліўся з нумарам школы і праз хвіліну ўжо быў на вуліцы. А сэрца гаворыла: дагані гэтага дзеда, дагані! Ён цягнуў сваю ношу да сьметніцы. Я дагнаў яго і запытаў, што ён цягне. Дзед спыніўся, зьняў з плячэй цяжар. З словамі «Нікому гэта ня трэба» павярнуў яго да мяне... Халодны пот пацёк па сьпіне, ногі падагнуліся, у грудзях сьціснулася. Перад маімі вачыма быў старажытны герб «Пагоня». Я выпрасіў яго ў дзеда за сымбалічную плату. Вымушаны быў заплаціць за герб, хоць і ведаю, што цаны яму няма. Адвёз дадому, вымыў, падфарбаваў. На сэрцы стала так лёгка. Усё ў нас яшчэ будзе.

Гэта герб нашай незалежнасьці. Герб, які адпавядае ўсім законам геральдыкі. Шкада, што мы пад гучнымі словамі аб новым жыцьці, аб сьветлай будучыні забыліся пра свае карані. Дзяржава, якая ня мае мінулага, ня мае будучыні. Шкада, што гэта бачаць нашыя дзеці.

**Рымашэўскі, Менск**

# Адбітак палітычнага рэжыму

Многія цяперашнія партыі мелі б не тусовачны характар, а сталі б шматтысячнымі, калі б ня іх правадыры. Эксцэс, што здарыўся ў ЛДПБ, можа паўтарыцца і ў дэмакратычным стане, бо «сындром Гайдукевіча» ўласьцівы і кіраўнікам не аднае дэмакратычнае партыі.

Кіраўнікі, якія, б'ючы сябе ў грудзі, клянуцца ў вернасьці дэмакратыі, выяўляюць няўменьне весьці дыскусію і знаходзіць кампраміс з апанэнтамі. Іншадумец для іх — асабісты вораг. Яны лічаць, што арытмэтычная бальшасьць можа не лічыцца зь меншасьцю. Гэтая бальшавіцкая завядзёнка, здаецца, невынішчальная. І ў гэтым сэнсе многія нашыя партыі — больш адбітак аўтакратычнага палітычнага рэжыму, чым поўнае адмаўленьне яго.

Беларуская сацыялістычная грамада за 15 гадоў працы здолела прывесьці беларускі народ да дзяржаўнасьці, зьдзейсьніць нацыянальную рэвалюцыю. Што здолелі БСДГ, БСДП (НГ) і БПП? Стварыць сваю «Нашу Ніву» яны ня могуць: няма людзей кшталту Івана і Антона Луцкевічаў, Вацлава Іваноўскага і Аляксандра Ўласава. Цяперашняе левадэмакратычнае крыло ў Беларусі — пародыя на меншавізм. Яно ня мае правадыроў, якія былі б адначасна мысьлярамі, тэарэтыкамі. Інтэлектуалы да сацыял-дэмакратыі ня горнуцца, а тыя, што былі, амаль усе пакінулі яе. Бо аўтарытарызм і інтэлектуалізм несумяшчальныя. Тое ж адбылося і з абодвума БНФамі.

Найлепш справы складаюцца ў АГП. Імёны Генадзя Карпенкі, Віктара Ганчара, Станіслава Багданкевіча, Анатоля Лябедзькі, Аляксандра Дабравольскага, Людмілы Гразновай і іншых дзеячоў АГП нямала кажуць і шырокай публіцы. Можна казаць і пра партыйны «мазгавы трэст».

Мажліва, гэта адзнака часу: левыя і нацыяналісты саступаюць лібэралам.

**Анатоль Сідарэвіч**



Гісторык, літаратурны крытык

ФОРУМ

**На форуме сайту «НН» узьнікаюць дыскусіі на самыя розныя тэмы. Прапануем урыўкі ўвазе чытачоў папяровае вэрсіі газэты.**

## Мова-2003

**Талер**
23.10.2003, 21:38
Мне здаецца, што расейскі выраз «забіць гол» можа гучаць па-беларуску як проста «лучыць», а «гол» — «лучаньне». Гэтак, «вырашальнае лучаньне — на Бялькевічавым рахунку».

**Хтося**
24.10.2003, 15:39
Забіць гол — улучыць. Гэта настолькі эратычна! Уяўляеце: Валянцін Бялькевіч у матчы з «Арсэналам» УЛУЧЫЎ Енсу Леману (брамнік лёнданцаў). Бедны Леманс!

## Пра «Лад»

**Savos**
24.10.2003, 12:09
І што вы цікавага знайшлі ў «Ладзе»?

**Bliskavitsa**
25.10.2003, 04:55
А хіба на Беларускім тэлебачаньні нельга зрабіць хоць адзін прыстойны канал? А то папросту нават калі захочаш што-небудзь добрае паглядзець, то трапляеш ці на крымінал, ці на бацьку (што яшчэ больш дэпрэсіўна), ці на мыльныя опэры. Мне падабаліся многія праграмы на расейскай «Культуры», чаму б не стварыць адпаведнік з добрага, а ня з дрэннага? І зусім няма перадач, якія б арыентаваліся на моладзь.

## Ці трэба «Гары Потэр» па-беларуску

**Johan**
25.10.2003, 17:14
Нядаўна прачытаў у «НН», што Глёбус заявіў, быццам тыя, хто чытае па-беларуску, Гары Потэра не чытаюць. Ён ня мае рацыі. На нашай мове трэба раскручваць «народныя» жанры: папсу, жоўтую прэсу, літаратурныя гіты. Інакш мова так і застанецца «элітнай». Вы гэтага хочаце???

**ByTryndzelka**
25.10.2003, 22:05
Ня ведаю, ці хацеў бы я, каб на мове раскручвалі папсу/мыла etc. Можа, на далёкую пэрспэктыву гэта было б добра, але калі ня будзе выбару або на беларускай гэта будзе рабіць лягчэй/больш прыбытак, дык яно само адбудзецца. Цяпер жа карыстацца мовай асэнсавана (ня маю на ўвазе, на жаль, бальшасьці вяскоўцаў, бо ў іх няма выбару) — гэта збольшага інтэлектуальна, элітарна, апазыцыйна etc. Што прыцягвае ўвагу людзей, якія хочуць быць далучаныя да гэтага высокага ўзроўню. Гары Потэр ці іншае па-беларуску — нічога ня маю супраць, але, на жаль, Глёбус правідлова сказаў пра сучасную тэндэнцыю...
**P.S.** А тым, што «Навіны» прапаганды па БТ сталі ісьці па-расейску, дык я вельмі задаволены.

**ByTryndzelka**
25.10.2003, 22:14
У адным ня меў рацыі: вельмі патрэбныя выданьні, песьні і мульцікі/фільмы на мове для дзетак і падлеткаў, каб падтрымаць і дапамагчы ім зрабіць асэнсаваны выбар карыстаньня ёю. Таму — хай жыве Гары Потэр па-беларуску!

**Ihar**
26.10.2003, 16:04
У брытанскім выданьні Гары Потэра напісана, што першая кніга з сэрыі выйшла ў перакладзе на лаціну і валійскую мову. З валійскай зразумела: хоць зь пяці мільёнаў тамтэйшага насельніцтва толькі для 12% валійская мова зьяўляецца першай, мясцовы ўрад праводзіць палітыку пасьлядоўнае падтрымкі мовы карэннага насельніцтва. Ня думаю, што ўрад фінансаваў выданьне Гары Потэра, — у Валіі дастаткова ахвотных зрабіць тое самастойна. З лацінамоўным выданьнем складаней. Трэба быць сапраўдным фанатыкам лаціны, каб перакладаць на яе Потэра. Але ж знайшоўся нехта!.. І, выглядае, Джаан Роўлінг была гэтаму радая. Абсурдна сьцьвярджаць, што Потэр непатрэбны па-беларуску, — няўжо толькі Вітку і Ягоўдзіка чытаць нашым дзецям? Яны добрыя кніжкі напісалі, але ёсьць шмат чаго яшчэ. Ня ўсе, хто гаворыць па-беларуску, будуць чытаць Глёбуса ці Хадановіча або Маркеса з Эка. Паола Каэльё гучаў бы па-беларуску добра і разумна. І Брыджыт Джонз магла б загаварыць па-нашаму.

**ByTryndzelka**
26.10.2003, 17:57
Я кажу, што калі рэсурсы абмежаваныя, дык трэба выбіраць, на што траціць час, сілы і грошы, каб мець максымальны вынік. Ці трэба друкаваць, напрыклад, у «НН» праграму ТВ або то якую аналітыку etc. Так і з пытаньнем, што лепш перакладаць-друкаваць цяпер. Што прынясе найбольшую карысьць Беларушчыне ЗАРАЗ, за гэтыя абмежаваныя грошы, за патрачаны час? Вось як стаіць пытаньне.

**http:// www.nn.by**

# Сцэнары для мары

## Стартуе беларуская «фабрыка зорак» «Рабі. Сябе. Сам.»

Патрабуюцца: self-made-асобы, якія самі «робяць» свой лёс. У пятніцу 14 лістапада афіцыйна стартавала кампанія «Рабі. Сябе. Сам.». Кампанія, якая спачатку задумлялася як сыціплы слайд-праект часопісу «Студэнцкая думка», вырастае ў самастойнае шоў з салідхай колькасьцю арганізатараў, здольнае ў будучыні прыцягнуць добрыя інвэстыцыі.

Акцыі папярэднічаў рэклямны артабстрэл: «Комсомольская правда в Беларуси» выходзіла зь вялізным надзагалоўкам «Хутка ўсё пойдзе паводле твайго сцэнару!», гэты ж лёзунг паўтарала «Альфа-радыё». На налепках, якія тыдзень перад стартам раздавалі маладзёны на вуліцах, была іншая формула: «Рабі. Сябе. Сам.». У Інтэрнэце плавалі абодва гэтыя заклёны — безь ніякіх спасылак... Старая, але дзейсная рэклямная пастка (згадайце перабудовачнага тэледзядзьку зь ягоным «прыйдзе час, і я скажу ўсё, што думаю наконт гэтага»). Аўтар гэтых радкоў таксама паспрабаваў сябе ў флэш-мобах каля ўнівэрсытэтаў. Рэакцыя студэнтаў была рознай: ад «дайце яшчэ налепачку» да млявага «на фіга?». А былі й такія, што вярталіся праз колькі часу і распытвалі пра акцыю. Аднак адзінае, што льга было казаць: «Чакай пятніцы, і ўсё пойдзе паводле твайго сцэнару!» Сапраўды, толькі ў пятніцу заінтрыгаваныя народныя масы задаволілі сваю цікавасьць на прэс-канфэрэнцыі, якая сабрала дзясятак СМІ, ды на сайце www.studumka.com.



АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

**Мікола Шакель (зьлева) і Сяргей Сахараў, рэдактары «Студэнцкай думкі», запраектавалі «Фабрыку зорак»**

Каб узяць удзел у кампаніі «Рабі. Сябе. Сам.», трэба сабраць каманду аднадумцаў і да 24 лістапада зарэгістравацца на згаданым сайце. Пасьля каманды запросяць на майстаркклясы, дзе будуць вучыць займацца піярам, абаронай аўтарскага права, рабіць тэле- і радыёрэкляму. Для рэгіянальных удзельнікаў абяцаюць наладзіць дыстанцыйнае навучаньне. У выніку кожная каманда мае распрацаваць свой варыянт рэклямнай кампаніі (тэле-, радыёролікі, акцыі etc.) для папулярызацыі «беларускай мары», якую сама ж мае і згенэраваць. «Гэта павінна быць агрэсіўная і прыцягальная, крыху модная і слушная рэклама. Яна мусіць прыцягнуць увагу грамадзтва», — кажа каардынатар праекту Сяргей Сахараў.

Паводле словаў рэдактара «Студумкі» Міколы Шакеля, некалькі дзясяткаў тысяч улётак сваю справу зрабілі: сайт папросту завалены заяўкамі на ўдзел у кампаніі. Мікола ня раіць шукаць ідэалёгії ў выбары партнэраў: «Арганізатары «Рабі. Сябе. Сам.» — гэта людзі, якім проста ня ўсё адно, што такое новае беларускае пакаленьне».

Як кажуць арганізатары, акцыя мае вылучыць крэатыўную і таленавітую моладзь для новай Беларусі і абвесьціць, што такое ўласна «беларуская мара». Яе мэта — паказаць, што і ў нашай краіне, насуперак агульнай думцы, ільга стаць папулярным і багатым. Толькі беларускія self-made'ы, кшталту Лявона Вольскага, ішлі да свайго статусу пасьпяховых людзей гады, а героям акцыі «Рабі. Сябе. Сам.» прапануецца зрабіць такі ўздым за месяц. Таму рэальная мэта — хутчэй знайсьці герояў, на чыіх імёнах пасьля мажліва будзе рабіць грошы. Гэта абсалютна нармальны прадусарскі ход, але для Беларусі зноў жа ў навінку. Вось толькі ці ня выйдзе з гэтага чарговы «тэлефабрыкат», калі бурбалка папулярнасьці трымаецца месяц і пасьпяхова зьнікае? Паглядзім. Беларуская «фабрыка зорак» «Рабі. Сябе. Сам.» стартуе на наступным тыдні.

**Сяргей Трафілаў**

## Дні сьвятога Язапата

**На Полаччыне й Віцебшчыне прайшлі мерапрыемствы з нагоды 380-годзьдзя пакутніцкай сьмерці арцыбіскупа полацкага Язапата Кунцэвіча.** 8 лістапада ўрачыстая служба адбылася ў полацкай грэка-каталіцкай царкве Параскевы Полацкай. У ёй узялі ўдзел пілігрымы з Украіны і тры ўкраінскія сьвятары. 9 лістапада адпаведныя мерапрыемствы прайшлі ў Віцебску — малебен тут ладзіўся на Ўсьпенскай горцы, побач зь месцам, дзе быў забіты ўніяцкі ярарх. 12 лістапада Дзень сьв.Язапата Кунцэвіча ў Воршы адзначалі ўсе каталікі: сьвяты зьяўляецца «афіцыйным» апекуном дыяцэзіі. Удзел бралі як рыма-каталікі, так і грэка-каталікі. А ў Лідзе 15 лістапада зьбіраліся рыма- і грэка-каталікі заходу Беларусі. Служылі біскуп Антоні Дзямянка і апостальскі візытатар для грэка-каталікоў а.Сяргей Гаек.

**Тамаш Гурба, Полацак**



**Абраз сьв. Язафата з полацкай царквы. Мастак Алесь Пушкін.**

НАВІНЫ

### Холадатэрапія па-бабруйску

**У бабруйскіх дзіцячых садках на выходныя адключаецца ацяпленьне. У працоўныя дні ў групах раяць падтрымліваць 18ºС.** Паводле словаў начальніка аддзелу адукацыі Першамайскага раёну, у памяшканьнях, «дзе не знаходзяцца людзі, тэмпэратура не павінна перавышаць 12 градусаў». Падчас вакацый такі тэмпэратурны рэжым падтрымліваўся ў школах, хоць усе настаўнікі выходзілі на працу.

**Людміла Кокаш, Бабруйск**

### Жыцьцё без сьвятла

**Каля 700 жыхароў Бабруйскага раёну штомесяц трапляюць у сьпісы няплатнікаў за электраэнэргію.** У кастрычніку з гэтай прычыны электрычнасьць была адключаная ў 95 кватэрах. У садовых кааператывах асабліва распаўсюджана несанкцыянаванае карыстаньне электрычнасьцю. Так, у кааператыве «Колас» трэцяя яе частка спажывалася без уліку.

**Людміла Кокаш, Бабруйск**

### Пажарнікі сьпяваюць

**Кампакт-дыск і аўдыёкасэта «Гэта наша работа» з 18 песьнямі, аўтары і выканаўцы якіх — выратавальнікі падразьдзяленьняў Міністэрства па надзвычайных сытуацыях Магілёўшчыны,** выйшаў дзякуючы ініцыятыве і падтрымцы абласнога ўпраўленьня. Тэксты дзьвюх песень — «Прафэсія — пажарны» і «Беражы вас Бог» — напісаў начальнік Бялыніцкага аддзяленьня МНС Станіслаў Бурко, а музыку — мясцовы кампазытар Віктар Халадцоў.

**Базыль Ліцьвіновіч, Бялынічы**

### Парцалянізацыя сталовак

**У большасьці баранавіцкіх школаў вучні сёрбаюць супы з алюміневых талерак.** Даўно вядома, што алюміневы посуд шкодзіць здароўю. Таму ўлады Баранавіч выдаткавалі 2 млн рублёў на парцалянавыя талеркі для школьных сталовак. Першая партыя посуду ўжо набытая ў Менску. На замену алюміневых лыжак зь відельцамі ды рондаляў, у якіх стравы гатуюцца, пакуль грошай не хапіла.

**Руслан Равяка, Баранавічы**

### «Хімвалакно» зьбірае ўраджай

**У Горках у месяцах збору сьмецьця пачалося ўсталяваньне спэцыяльных кантэйнэраў для плястмасы і выкарыстаных ПЭТ-бутэлек.** Сыравіна будзе перадавацца на вытворчае аб'яднаньне «Хімвалакно». Каб прадухіліць выкарыстаньне скрыняў не паводле прызначэньня, камунальшчыкі закрываюць скрыні на замок, пакідаючы круглыя адтуліны па дыямэтры бутэлек.

**Эдуард Брокараў, Горкі**

### Паехалі па сьмерць

**На мінулым тыдні ў Чэрыкаве хавалі двух мясцовых жыхароў, якія працавалі на будоўлях Масквы і загінулі гвалтоўнай сьмерцю.** Гэта ня першы выпадак, калі з сталіцы суседняй краіны ў Чэрыкаў прывозяць забітых рабочых. Падобная сытуацыя назіраецца і ў суседніх гарадах: Клімавічах, Крычаве, Касьцюковічах. Аднак недахоп працоўных месцаў на радзіме і нізкія заробкі літаральна выштурхоўваюць мужчын у Расею. Іх не спыняе нават небясьпека для жыцьця.

**Алег Сорын, Чэрыкаў**

### 2% псыхічна нездаровых

**Паводле афіцыйных зьвестак, на кожныя 100 тысяч насельніцтва Магілёўшчыны прыпадае 1977 чалавек, што пакутуюць на псыхічныя захворваньні.** Паказьнік неблагі: у сярэднім у краіне на 100 тысяч здаровых грамадзян прыпадае 2201 грамадзянін з псыхічнымі адхіленьнямі. Аднак рэальна колькасьць псыхічна нездаровых людзей большая — ня ўсе зьвяртаюцца па дапамогу да лекара.

**«Вечерний Могилёв»**

### «Сатанінскі» пашпарт

**Каля дзесяці магілёўцаў здалі ў пашпартна-візавую службу раней атрыманыя пашпарты новага ўзору.** Яны не жадаюць мець дакумэнт, у якім апроч нумару пашпарту пазначаны таксама і асабісты нумар, які, на думку некаторых, зьяўляецца «сатанінскім» знакам і несумяшчальны з хрысьціянскай верай. Колькасьць «адмаўленцаў» увесь час мяняецца: яны то спрабуюць здаць пашпарты, то забіраюць іх назад. Праваслаўныя сьвятары тлумачаць, што нумар у дакумэнце на выратаваньне душы ніяк не ўплывае, хоць лепей абыходзіцца без нумароў.

**«Могилёвская правда»**

### Магілёў даў прытулак Эсі Шур

**На сталае жыхарства ў Магілёў пераехала эстонская праваабаронца, старшынька аб'яднаньня пэнсіянэраў эстонскага гораду Сіламяэ Эся Шур.** З ініцыятывы гэтай жанчыны адбылося больш за 200 мітынгаў і пікетаў у абарону некарэннага насельніцтва. Летась спадарыня Шур і яе аднадумцы беспасьпяхова зьвярталіся ў краіны Заходняй Эўропы, ЗША і Ізраіль з просьбай аб палітычным прытулку. У Магілёве праваабаронца мае намер пісаць раманы на крымінальна-палітычныя тэмы.

**«Веснік Магілёва»**

## Памяць пра Ганну Місуну

**14 лістапада на Ветрыншчыне (Полацкі раён) адкрылі адразу два мэмарыяльныя знакі.** Чарговы раз ініцыятарам ушанаваньня памяці славутых землякоў выступіў мясцовы краязнаўца Віктар Карасёў. Два шматтонныя валуны з мэмарыяльнымі шыльдамі зьявіліся на месцы былога маёнтку (побач зь вёскай Дубройкай), у якім нарадзілася першая жанчына-геоляг Беларусі і тагачаснай Расейскай імпэрыі Ганна Місуна, і ў самім Ветрыне, на вуліцы, якая цяпер носіць яе імя. Працуючы ў архівах, В.Карасёў знайшоў матэрыялы, якія даводзяць, што Місуна паходзіць зь Ветрыншчыны, а ня з Чашніцкага раёну, як пазначана ў большасьці энцыкляпэдыяў.

Ганна Місуна нарадзілася 12 лістапада 1868 г. у сям'і збяднелае шляхты — Баляслава-Казімера і Марыі-Ганны Місунаў. Спачатку вучылася ў хатняга настаўніка, пасьля — прыватная гімназія ў Рызе, вучоба ў Маскве. З 1906 г. Ганна робіцца асыстэнткаю пры геалягічным кабінэце Вышэйшых жаночых курсаў. Вынікам першых палявых дасьледаваньняў жанчыны-геоляга сталася праца «Матэрыялы да вывучэньня канцавых марэн Літоўскага краю». Місуна выкладала геалёгію цэнтральнай і заходняй Беларусі, высьветліла стратыграфію ледавіковых адкладаў і выявіла сярод чацьвярцічных утварэньняў сьляды некалькіх зьледзяненьняў. Завершыўся жыцьцёвы шлях Ганны Місуны ў 1922 г. у Маскве, дзе яна і пахаваная на Новадзявочых могілках.

У мерапрыемствах па адкрыцьці мэмарыяльных знакаў узялі ўдзел супрацоўнікі Інстытуту геалёгіі Акадэміі навук.

**Васіль Крoква**

# Новае ў Сьпісе сусьветнай спадчыны

На пачатку лістапада ЮНЭСКА ўнесла ў Сьпіс вуснай і духоўнай спадчыны чалавецтва яшчэ 28 найменьняў. Гэты сьпіс вядзецца ўжо трэці год. У яго ўключаюць зьявы, якім пагражае глябалізацыя ды яе наступствы (некантраляванае разьвіцьцё турызму, палітычная нестабільнасьць і эканамічныя крызысы). З 56 «кандыдатураў» экспэрты ЮНЭСКА абралі наступныя:

азэрбайджанскія сьпевы-мугамы;

карнавал у Бэншы (Бэльгія), які сьвяткуецца напярэдадні Вялікага посту, — адзін з найстарэйшых у Эўропе;

андыйская касмаграфія этнічнай групы калавая (Балівія), якая ўключае вераваньні, міты, рытуалы і тэатральныя відовішчы;

вусная і графічная традыцыі народу ваджапі (Бразылія) — іх засталося 580 чалавек у бразыльскім штаце Амапа;

вусная традыцыя пігмэяў-ака (Цэнтральна-Афрыканская Рэспубліка), якіх засталося каля пяці тысячаў;

каралеўскі балет Камбоджы, якому больш за тысячу гадоў (рытуальныя танцы выконваліся падчас каранацыяў, каралеўскіх вясельляў і г.д.);

мастацтва ігры на сямiструнным інструмэнце гуцінь (Кітай), вядомым больш за 3000 гадоў, — забаўка старакітайскіх арыстакратаў ды інтэлектуалаў;

карнавал у калюмбійскай Баранкільі (ладзіцца апошнія чатыры дні перад Вялікім постам ды спалучае афрыканскія й індзейскія традыцыі);

музыка ўсходняга брацтва Ля Тумба Франсэза (Куба), помнік афра-гаіцянскае культуры;

сярэднявечны эгіпэцкі эпас «Аль-Сырах аль-Хілялія» пра арабскую міграцыю паўз Паўночную Афрыку;

культурная прастора выспы Кіхну (Эстонія), 600 жыхароў якой жывуць у геаграфічнай ізаляцыі ад мацерыка;

ведычныя сьпевы (Індыя);

лялечны тэатар ваянг (Інданэзія), якому больш за тысячу гадоў;

спадчына маронаў з Муртаўну (Ямайка) — колішніх беглых рабоў, якія стварылі сваю рэлігію — крэманці;

лялечны тэатар Нінгіё Ёруры Бунраку (Японія), які ўзьнік у XVII ст.;

мастацтва кіргіскіх апавядальнікаўакынаў (Кыргыстан), якія захоўваюць тысячагадовы эпас «Манас» (у 16 разоў даўжэйшы за «Іліяду» й «Адысэю»), а таксама эпасы «Сэмэтэй» і «Сэйтэк»;

драўляныя вырабы народнасьці зафіманіры (Мадагаскар);

абрад «вяртаньня ў зямлю», прысьвечаны сьмерці (Мэксыка), адзначаецца з дакалюмбавых часоў пры канцы кастрычніка — на пачатку лістапада;

традыцыйная музыка, якая граецца на морын-хуры — дзьвюхструннай скрыпцы з конскай галавой (Манголія);



АНАТОЛЬ КЛЯШЧУК

Беларускія спэцыялісты прапануюць уключыць наша Купальле ў Сьпіс сусьветнай спадчыны

эпічныя сьпевы пансоры (Паўднёвая Карэя), вядомыя з XVII ст.;

лякаляка — танцы й сьпевы тонга падчас каранацыі манарха й іншых важных цырымоніяў (Тонга);

эпічны тэатар актораў-мэдахаў (Турцыя);

малюнкі на пяску (Вануату), што дапамагаюць паразумецца жыхарам цэнтральнай і паўночнай часткі архіпэлягу, якія размаўляюць на 80 розных мовах;

каралеўская музыка нга-нгак (Віетнам), якая з XIII ст. выконваецца на рэлігійныя сьвяты і юбілеі;

ірацкая клясычная музыка — макам;

вясельныя песьні сана (Емэн), вядомыя з XIV ст.;

фэстывалі балтыйскіх песьняў і танцаў (Літва, Латвія, Эстонія), на якія зьбіраюцца да трыццаці тысячаў сьпевакоў і каля дзесяці тысячаў танцораў (узьніклі ў Эстоніі ў 1869 г., у Латвіі ў 1873 г., у Літве ў 1924 г.);

музыка шашмагом — клясычны традыцыйны жанр мультыкультурных урбаністычных цэнтраў Таджыкістану й Узбэкістану, які разьвіўся ў суфійскай рэлігійнай плыні ісламу цягам апошніх дзесяці стагодзьдзяў.

Гэтыя 28 культурных зьяваў дадаліся да 19, унесеных у Сьпіс у 2001 г. Тады духоўнай спадчынай чалавецтва былі абвешчаныя:

мова, танцы й музыка народнасьці гарыфуна (Бэліз);

вусная спадчына геледаў народнасьці ёруба (Бэнін);

карнавал у Аруры (Балівія), у якім бяруць удзел 28000 танцораў і 10000 музыкаў;

опэра Кунцю (Кітай), якая вядзе сваю гісторыю з X—XIII ст.;

цырымонія гбоф у вёсцы Афоўнкага народнасьці тагбана (Кот д'Івуар);

грузінскія поліфанічныя мужчынскія сьпевы;

вусная спадчына народнасьці запара (Эквадор, Пэру), прадстаўнікоў якой засталося ня больш за 300 чалавек, а мову ведаюць усяго пяцёра старых;

тэатар Нагаку (Японія);

сыцылійскі лялечны тэатар;

культурная прастора брацтва ў Віля Мэля (Дамініканская Рэспубліка);

арэал ужываньня сакральнага інструмэнту соса-бала (Гвінэя), які выкарыстоўваецца на мусульманскі Новы год, а таксама для акампанэмэнту пры выкананьні афрыканскага сярэднявечнага эпасу;

мастацтва стварэньня крыжоў і іх сымбалізм (Літва);

санскрыцкі тэатар Кітыятам (Індыя), найстарэйшы ў тэатральнай традыцыі Індыі;

культурная прастора Джэмаа эль-Фна — сымбаль гораду XI ст. (Марока);

сьпеўны эпас гудгуд народнасьці іфугао (Філіпіны), які складаецца з 200 песень па 40 эпізодаў у кожнай;

абрад каралеўскага пахаваньня і рытуальная музыка ва ўсыпальні Джангмыё ў Сэуле (Паўднёвая Карэя);

вусная культура і культурная прастора семеіскаў — старавераў, якія жывуць у Прыбайкальлі з XVII ст. і размаўляюць расейска-беларуска-ўкраінска-бурацкай трасянкай;

сакральная музычная драма пра сьмерць, ушэсьце і ўкаранаваньне Панны Марыі, якую паказваюць зь сярэдзіны XV ст. у базыліцы Санта-Марыя дэ Эльхе (Гішпанія);

культурная прастора вобласьці Байсуна — адной з найстарэйшых населеных мясцовасьцяў сьвету (Узбэкістан), дзе сёньня вызнаюць зараастрызм, будызм, іслам, шаманізм і татэмізм.

Наступнае папаўненьне Сьпісу мае адбыцца ў 2005 г. Літоўскія, латыскія ды расейскія зьявы ў яго ўжо трапілі. Беларускіх, украінскіх і польскіх пакуль няма. Паводле інфармацыі «НН», сёньня беларускія спэцыялісты абмяркоўваюць «кандыдатуры» батлейкі, купальскіх абрадаў ды фальклёрнае спадчыны Гомельскага Палесься.

**Адам Воршыч**

# Што з архівам Арсеньневай

«НН» у №38 пісала пра частку архіву Натальлі Арсеньневай, згубленую амэрыканскай поштай. За гэты час сёе-тое ў цёмнай справе праясьнілася. Высьветлілася, што архівіст Рады БНР Лявон Юрэвіч, імя якога ўзгадвалі ў сувязі з гэтай справай, у страце не вінаваты.

Сп.Юрэвіч адрэагаваў на артыкул апэратыўна, разьмясьціўшы на форуме сайту «НН» свой адказ: «Пра архіў Арсеньневай у мяне была гаворка з сп.Дубаўцом, калі той прапанаваў мне да ўгодкаў паэткі падрыхтаваць матэрыял «зь месца»: маўляў, тут архівы, ёсьць што скарыстаць. Тады я і адказаў, што па сьмерці Арсеньневай ейны сын Уладак выслаў (прынамсі, так казаў) пачак ці два пачкі ў БІНіМ. Яны так і не прыйшлі. Што сталася зь імі, дакладна невядома — мо згубіліся, а мо й не высылаліся ніколі».

На вялікі жаль, з сынам паэткі Ўладзіславам Кушалем «НН» дагэтуль скантактавацца не змагла, бо ніхто ня можа даць ягонага тэлефону. Сваё меркаваньне на форуме «Беларускай палічкі» выказаў Сяржук Сокалаў-Воюш.

«Некалі я быў у Натальлі Арсеньневай у Рочэстэры, размаўляў зь ёй, зь ейным сынам, з унукам, які нават не падазраваў, што ягоная бабуля — знакамітая паэтка. У гэткіх выпадках да папяровай спадчыны (калі гэта ня грошы) ставяцца зазвычай абыякава, маўляў, ат, нейкія бабуліны паперкі — і яны апынаюцца там, дзе паперкі нашых бабуляў. Часам, вядома, пакідаюцца на памяць дыплёмы, пасьведчаньні, але найчасьцей і яны ідуць у сьметніцу. Вось мы і не ведаем нічога пра нашых прашчураў. У выпадку Арсеньневай справа зусім простая, і, калі каротка, сын паэткі — чалавек з выдатнай беларускай мовай — творчасьцю маці не цікавіўся, а бацьку (генэрала Кушаля) лічыў дзіваком. Адпаведна, ягоны сын, унук спадарыні Натальлі, ні да якіх беларускіх справаў далучаным ня быў... Таму і архіў паэткі, калі ён увогуле яшчэ існуе, у найлепшым выпадку ляжыць недзе на гарышчы ейнай хаты. Ніхто ніколі нікога не запрашаў яго ўзяць», — напісаў Воюш.

Міністэрствы замежных справаў, культуры, што мусілі б прыходзіць на дапамогу беларускай дыяспары, калі ў тае не хапае «рук» на захаваньне спадчыны агульнанацыянальнага значэньня, пакуль не ўзялі голасу ў справе.

«НН» вернецца да тэмы.

**Аркадзь Шанскі**

# Князь правінцыі і яго «Прывід»

**Прэзэнтацыя кнігі палачаніна Алеся Аркуша «Прывід вясны» сабрала 11 лістапада ў ПЭН-цэнтры самых вядомых сталічных крытыкаў і паэтаў.**

Сама кніжка — своеасаблівае the best: сюды ўвайшлі вершы, напісаныя Аркушам за пятнаццаць гадоў. «Калі я перачытаў свае вершы, дык зноў паверыў у сілу паэзіі», — прызнаўся аўтар. Потым выправіўся: «У магчымасьці паэзіі».

Казалі шмат ухвальнага, старшыня ПЭНу Лявон Баршчэўскі зычыў Аркушу выдаць сорак паэтычных зборнікаў («Гэта сёмая кніжка», — зазначыў аўтар «Прывіду»). Празаік і выдавец Уладзімер Сіўчыкаў згадваў супольнае з Аркушам дзяцінства: «Мы ўскормленыя адной каровай». Крытык Пётра Васючэнка распавядаў, як ён з Аркушам, Баршчэўскім, Ірынай Дарафейчук і Навумам Гальпяровічам елі ўначы юшку зь яшчара, якога злавілі ў возеры Нешчардзе.

Правакацыямі займаліся на сустрэчы крытыкеса Ганна Кісьліцына ды «ўсюды адсутны» Валянцін Акудовіч. Кісьліцына дарэшты сплюндравала Аркушавы вершы — асабліва люта дасталося радку «Але птах ня стане на калені». Крытыкеса, якая на вокладцы сваёй кнігі зьявілася ў абліччы ласкавага зайкі, добра знаецца ў біялёгіі: «Колькі жыву на сьвеце, ня бачыла ніводнай птушкі, якая б апускалася на калені. Нават курыца!»

Акудовіч папракаў Аркуша за здраду: «Князь правінцыі, які аб'яднаў усю беларускую правінцыю ў змаганьні супраць Менску, выдаў сваю кнігу ў сталіцы». Аркуш справабаваў адбівацца: «Цяпер няма правінцыі, я выдаў кнігу ў правінцыйным Менску».

**АВ**

# Прэзэнтацыя ў «Камяніцы»

**«У карчме калі мы былі, справы нас не клапацілі», — так пачынаецца папулярная сярэднявечная песьня, якую ўжо ў сьнежні можна будзе пачуць і пабачыць па тэлевізіі ў выкананьні гурту «Стары Ольса».**

Прэзэнтацыя кліпу і новага альбому «Шлях» адбывалася ў менскай кавярні «Камяніца», з драўлянымі сталамі, кажанамі пад столльлю і выявамі князёў па сьценах. Прэзэнтавалі кліп музыкі ў строях XVI ст. Відэатэхніка адмаўлялася працаваць у сярэднявечным асяродзьдзі, але пасьля таго, як лідэр «Старога Ольсы» Зьміцер Сасноўскі голасна абвясьціў: "Я веру!" — здарыўся цуд і відзік паслухмяна паказаў кліп. У роліку музыкі і рыцары спажываюць вялікую колькасьць пітва і ежы. Здымаўся ён у паляўнічым дамку на Магілёўшчыне, і калі на здымках Сасноўскі пашкодзіў сабе руку, яго давялося везьці ў больніцу за 150 км.

Зьміцер марыць стварыць музыку да «Пахвалы Вітаўту». Палякі ж, мяўляў, сканструявалі на падставе летапісных тэкстаў ухвальныя песьні пра сваіх князёў. У «Старога Ольсы» ўжо ёсьць досьвед стварэньня квазістаражытных мэлёдый пры захаваньні старых канонаў. Часам нават спэцыялісты не адрозьніваюць іх ад аўтэнтычных. Яшчэ мара — давесьці, насуперак дасьледчыкам, што ў Беларусі былі гусьлі. Адзін з музыкаў «Старога Ольсы», Аляксандар Чумакоў, нават занятая рэканструкцыяй гусьляў. На яго рахунку ўжо чатыры зробленыя інструмэнты.

Канцэртная прэзэнтацыя дыску адбудзецца 28 лістапада на філфаку БДУ (вул. Маркса, 31). А ў «Камяніцы» штонядзелю граюць жывую беларускую музыку.

**Вераніка Дзядок**


Справа налева музыкі «Ольсы»: Аляксандар Чумакоў, Каця Радзівілава, Ільля Кубліцкі ды Зьміцер Сасноўскі

АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

ДЫСКАГРАФІЯ

# VIZA «NRM»



Розныя выканаўцы. (р) «БМА-group», 2003

Па леташнім «Personal Depeche» маем чарговы трыб'ют, які энэрэмшчыкі, безумоўна, заслужылі. Аднак чым большая значнасьць падзеі, тым большыя мусяць быць да яе патрабаваньні.

«БМА» зрабіла вялікую працу, альбом удаўся на «добра». Разам з тым зноў прабілася старая хвароба гэтага выдаўца: ва ўсіх зборніках «БМА» маюцца нумары, прысутнасьць якіх зусім неабавязковая.

Шэраг нумароў падаюцца адно толькі зьлепкамі арыгіналу, калі пра нейкі пошук, прысутнасьць уласна задумкі аранжаваньня казаць цяжка. Гэткія песьні ў выкананьні групаў «Partyzone», «B.N.» і «Куклы» («Партызанская», «Дзед Мароз» і «На вуліцы маёй») адпаведна). Выдумкі ў гэтых вэрсіях няшмат, свайго амаль ня ўкладзена. DJ Freax ды Цягні-Штурхай») («Песьні пра каханьне») і Аня Багданава («Тры чарапахі-2») проста зрабілі зь песьняў гэткія весялухі, «Ю.Вецер» (песьня «Фабрыка») і «Краскі» («Тры чарапахі») — банальныя дыскатэчныя нумары, якія, магчыма, некаму могуць нават спадабацца. «Мы жывем ня кепска» ў выкананьні «Angry Rose 2000» — твор на аматара, а падчас канцэрту ўвогуле праваліўся. Бо не канцэртны нумар. Куды больш сур'ёзна пралічыліся «Цягні-Штурхаі», бо, здаецца, так і не адчулі трагічнасьці атмасфэры песьні «Лёгкія-лёгкія». Але найбольш значны пралік прадусараў — гэта «Худсавет» у выкананьні (калі гэта можна назваць выкананьнем) «Long Play». Прабачце, але дзяўчаты нават у запісе фальшывяць, а падчас канцэрту выглядалі як удзельнікі заводзкай самадзейнасьці. «Плэю» было няшмат і, дзякаваць Богу, ня «лонг»...

На выгляд простыя песьні «NRM» на практыцы выявіліся моцным арэшкам, аб які многія ўдзельнікі трыб'юту істотна пашкодзілі творчыя зубкі. Бо аранжаваньне — праца ня менш складаная, чым уласна кампазыцыя, а трыб'ют — якраз той выпадак, калі аранжаваньне выходзіць на першы плян.

У гэтым сэнсе зьвяртае на сябе ўвагу «Паветраны шар», выкананы рэпэрамі «Нестандартная варыянту» з удзелам самога Лявона Вольскага. «J_Mors» сыгралі «Катуй-ратуй» інтэлігентненька, чысьценька і стылёва. «Палац» і DJ Ray, якія разам з «Краскамі» ўвасобілі «Тры чарапахі», паставіліся да арыгіналу сапраўды творча. «PLAN.» у цэлым годна прачыталі «Маё пакаленьне», хоць крыху і перабралі з патэтыкай. Але ненашмат. Вераніка Круглова з групай «Калахары» таксама знайшлі свой падыход да просьценькай «Одзірыдзіны», спалучыўшы ў адно ўласны стыль ад «Крыві» і арыгінальны настрой песьні.

Я ня стаўў за мэту прайсьціся па кожным з 21 удзельніка трыб'юту: час пакажа, якія з гэтых вэрсіяў застануцца жыць у вякох. Пра ролю «Візы» найлепш выказаўся Піт Паўлаў: трыб'ют прымусіў многіх выканаўцаў упершыню зьвярнуцца да беларускай мовы.

Віталь Супрановіч не выключае зьяўленьня «Візы-2». Але ў такім выпадку ён мусіць рэзка ўзьняць яе кошт — больш патрабавальна паставіцца да прэтэндэнтаў трапіць у альбом. Бо падчас канцэрту было яскрава бачна: усе працавалі бадай у аднолькавых умовах, але ж самі «NRM» прагучалі на галаву вышэй за практычна ўсіх удзельнікаў трыб'юту.

**Завізаваны Слухач**

# Паравіны году



Зьміцер Вайцюшкевіч. (р) 2003

Мы маем справу з надзвычай інтэлігентнай, тонкай работай. Яе вытрыманая да драбніц стылёвасьць можа лічыцца ўзорна-паказальнай. На «Паравінах году» далей разьвіваюцца прынцыпы, закладзеныя ў папярэдніх «Балядах»: вытанчанае гучаньне (у асноўным неэлектрычных інструмэнтаў), спакойныя, але дакладныя аранжаваньні і зьвязаныя з гэтым тэматычныя акцэнты, дзякуючы якім агульны мэлядызм праграмы ня толькі не паўтараецца, а ў разнастайнасьці сваёй утварае дзіка зьлітны твор. Усярэдзіне ж яго кожная з тузіну «паравінаў» грае ды зьзяе ўласнымі, непаўторнымі гранямі. Ай, хораша як грае!..

А вось што новае ў параўнаньні з «Балядамі» можна тут назіраць, дык гэта баль рытмікі. Лёгкая лаціна ў «Піяна», нешта накшталт хуткага факстроту ў «Пошуках адказаў», вальсок у «Прыйдзі, мой каханы» і гэтак далей. Вось, думаецца, у чым музычная нечаканасьць альбому: Вайцюшкевіч кінуў гожыя вершы Алеся Камоцкага ў абдымкі правераных часам рытмаў клясычных ужо бальных танцаў і тым самым стварыў пэўную рэтра-атмасфэру ящчэ тых, дарок-нрольных часоў. І трапіў ня тое што ў «дзясятку», а ў самае вушка іголкі!

А яшчэ дызайн, запіс, ігра запрошаных салістаў — літаральна ўсё зьдзейсьнена на найлепшым узроўні. Нават прычапіцца няма да чаго. Хоць...

Калі зыходзіць з назвы альбому, дык у ім і павінна быць толькі 12 песень. Дык вось: Вайцюшкевіч яўна паленаваўся — мог бы напісаць песьні не на кожны месяц, а на кожны тыдзень.

І тады прэтэнзій не было б!

Паслухаць «Паравіны году» ўжывую можна будзе ў пятніцу, 21 лістапада, у дольнай залі Чырвонага касьцёлу. Пачатак а 19-й.

**Уражаны Слухач**

# Волна




Гурт «Савана». (р) 2003

Гэтыя дзьве прыгожыя сястрычкі ўпершыню далі пра сябе знаць, калі як дуэт «LINS» працавалі на падпеўках у гурце «Mojo Blues». Яшчэ Алена Якавенка (тая, што блёнд), аўтарка практычна ўсяго рэпэртуару, падыгрывала на клявішах Аляксандру Саладуху, а пасьля ўгаварыла Натальлю ўвасобіць у запісе ўласныя амбіцыі.

Гэта ня музыка для дансынгу. Тэксты бяз глупстваў (амаль) і без настойлівых паўтораў якой-небудзь непісьменнай фразы, уласьцівых большасьці прадстаўнікоў расейскай папсы. Я б нават ня стаў называць музыку «Саваны» папсой. Тое, што робіць нашыя дзяўчаты сваімі ня дужа яскравымі галасамі, не назавеш «асятрынай другой сьвежасьці». Спакойная, гэткая вечарова-саванная музыка, якая ня можа быць фонам, але й не нясе трыбуннага настрою. Проста дастаткова шчырыя, адкрытыя песьні без прэтэнзій на этэры і месца ў гіт-парадах.

У запісе праграмы паўдзельнічалі вядомыя музыкі — Кастусь Гарачы («Apple Tea», клявішы), Серж Вядзьмедзь (экс-«Зіндан», «Верасы», гітара), Дзьмітры Лук'янчык (экс-«Тройца», ударныя), Карэн Карапецян (скрыпка) і інш. З такімі партнэрамі, нават калі вельмі пастараешся, дрэнны прадукт наўрад ці выраб'іш — не дадуць. Нават у глухой саване.

**Засаваны Слухач**

ON-LINE-ПАРАД

# «Уліс» і «Палац» папярэдзе тузіну

Першыя два туры галасаваньня на гіт-парадзе «Тузін гітоў» у Інтэрнэце засьведчылі цікавасьць слухачоў да песень з так і ня выдадзенага праекту «Скрыпка дрыгвы» на вершы Ўладзімера Караткевіча. «Устану ранкам» у выкананьні «Улісу» заняла першае месца ў 1-м туры (вынікі падводзяцца двойчы на месяц). «Скрыпка дрыгвы» ў выкананьні «Нэйра Дзюбэлю» толькі ў апошні дзень галасаваньня ў 2-м туры здала пазыцыі песьні «Ў лузе» («Палац»). «Дзень без гарэлкі» Аляксандра Памідорава заняў трэцяе месца.

Найменш галасоў сярод дванаццаці прапанаваных гітоў набралі «Ляпіс Трубяцкой» (песьня «Курвы таньчаць баль»), «Беларускія песьняры» («Алеся») і Валік Грышко («Каханая»). Яны вылятаюць з тузіну. Заміж іх у барацьбу з 3-га туру ўступаць «Аляксандра й Канстанцін» («Едзе сястра к брату»), «Куклы» («Хлопчык»), Зьміцер Вайцюшкевіч («Я йшоў да цябе»). Увесь новы тузін можна праслухаць па адрасе http://music.fromby.net з 10 да 24 лістапада.

**Сяргей Будкін**

# Алег Латышонак: За стомільённую канфэдэрацыю і касьмічны флёт

**Гісторык зь Беластоку Алег Латышонак не падзяляе радасьці палякаў з прычыны далучэньня да Эўразьвязу. Дый Беларусь, на яго думку, «у Эўропу» імкнуцца ня мусіць. Гэты вэтэран палітычнае барацьбы (пачынаў разам з «Салідарнасьцю») і адзін зь лідэраў беларусаў у Польшчы марыць пра аднаўленьне магутнай Рэчы Паспалітай. Карэспандэнт «НН» гутарыць з А.Латышонкам у рэдакцыі газэты.**



АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

Усе мае аднагодкі больш радыкальныя, чым нашыя студэнты. Цяперашняе маладое пакаленьне, у сваёй большасьці, — прыстасаванцы.

**Алег Латышонак:** Я быў супраць таго, каб Польшча ўступала ў Эўразьвяз. Таму не магу сказаць, што мне падабаецца ідэя ўваходу ў Эўразьвяз Беларусі. Я лічу, што ў Цэнтральнай Эўропе трэба адбудоўваць Рэч Паспалітую. Вядома, на новых умовах, але такую, якой яна была калісьці: Польшча, Украіна, Беларусь. Такая канфэдэрацыя мела б сто мільёнаў насельніцтва, вялізную армію, нават касьмічны флёт...

**«НН»: І шмат у Вас аднадумцаў?**

**А.Л.:** Не, у Польшчы іх зусім няма. Частка людзей — за аб’яднаньне з Эўразьвязам, частка баіцца немцаў і ня вельмі імкнецца ў Эўразьвяз, іншыя спадзяюцца на амэрыканцаў, але ніхто не спадзяецца на сябе. І гэта страшна.

**«НН»: У беларускіх умовах раней дадавалася яшчэ спадзяваньне на Расею, што зыходзіла ад улады.**

**А.Л.:** Я не заўважаю ніякай зьмены, ніякага накіраваньня на незалежнасьць Беларусі. Для мяне ўсё як было, так і застаецца. Я ніколі ня быў вялікім крытыкам Аляксандра Лукашэнкі, дый наагул мне здаецца, што якраз ня ў ім праблема.

**«НН»: А ў кім? Няўжо і вы будзеце наракаць на лідэраў апазыцыі?**

**А.Л.:** Я іх усіх ведаю. Гэта добрыя людзі і добрыя палітыкі. Не хацеў бы гаварыць пра тое, чаго ім не хапае. Проста няма цяпер такога лідэра, які патрэбны. Але, мне здаецца, у сытуацыі, калі вялікая частка грамадства застаецца абыякавай да таго, што адбываецца, ні геній, ні звышчалавек ня зможа памяняць сытуацыю. Таму я лідэраў апазыцыі ні ў чым не лічу вінаватымі.

**«НН»: Вы неяк казалі, што ў палітыцы ня трэба гаварыць, трэба дзейнічаць...**

**А.Л.:** Я прыхільнік сьцверджаньня ці парады, якую даў усім нам Алесь Чобат. На гэты момант перад беларусамі стаіць не пытаньне «Што рабіць?», а пытаньне «Чаго не рабіць?». На мой погляд, гэта сьвятыя словы, якія ўсе людзі, што займаюцца палітыкай у Беларусі, павінны ўзяць пад увагу.

**«НН»: І чаго ж нельга рабіць?**

**А.Л.:** Нельга здаваць свае пазыцыі! Ня трэба шукаць выхад з тупіковай сытуацыі ўсялякім коштам. У сытуацыі, калі немагчыма зрабіць тое, што трэба, лепш нічога не рабіць.

**«НН»: Дык што, сядзець склаўшы рукі?**

**А.Л.:** Найперш ня варта займацца выбарамі, пра якія загадзя гаворыцца, што яны несапраўдныя. Я проста не разумею такой сытуацыі, калі хтосьці ўваходзіць у не сваю гульню на чужых правілах і хоча чагосьці дабіцца...

**«НН»: І чым Вы радзіце займацца апазыцыйным палітыкам, калі кажаце, што ім нічога ня сьвеціць?..**

**А.Л.:** Кожны мусіць сам выбіраць. Я маю такую прафэсію, што, так ці інакш, працую на карысьць Беларусі. Палітычная сытуацыя цяпер якраз такая, што, можа, лепш займацца гэтымі справамі?.. Сытуацыя ў краіне такая тупіковая, што толькі нейкі вонкавы фактар можа на яе паўплываць. На жаль, на сёньняшні дзень я ня бачу, каб хто з палітыкаў ці палітолягаў сказаў, як яе зьмяніць зь сярэдзіны.

**«НН»: Гэта значыць, што палітычныя кааліцыі, якія цяпер ствараюцца, Вы не ўспрымаеце ўсур’ёз?**

**А.Л.:** Я, прызнаюся шчыра, ужо гэтым не цікаўлюся. Не хачу нікога пакрыўдзіць... Я магу гаварыць толькі пра свае прыватныя адчуваньні. І вось я бачу, што ў дадзены момант адбываецца гульня па чужых правілах.

**«НН»: Ці дапускаеце Вы, што гэткая сытуацыя можа нарадзіць пратэст, у палітыку прыйдзе моладзь і апазыцыя радыкалізуецца?**

**А.Л.:** Я — выкладчык і ведаю сотні студэнтаў. Усе гэтыя маладыя людзі намнога менш радыкальныя, чым маё пакаленьне. Мы ўжо пастарэлі, усе мае аднагодкі ў сярэдніх гадах, але мы больш радыкальныя, чым нашыя студэнты. Цяперашняе маладое пакаленьне, у сваёй большасьці, — прыстасаванцы. Я гавару ня толькі пра беларусаў, але і пра маладых палякаў. Прыстасаванцы, якія стараюцца знайсьці сабе месца на будучыню. Яны маюць надзею, што кожны зь іх абхітрыць сваіх сяброў, аднагодкаў, грамадзтва і неяк уладкуецца. Але яны прайграюць, бо немагчыма так, каб усіх абдурыць. Можа, удасца аднаму-другому... Гэтае пакаленьне прайгранае ўжо на старце.

**«НН»: У 90-я можна было пачуць, што «Чачэнія змагаецца і за беларускую незалежнасьць». А ці здольныя, на Ваш погляд, беларусы змагацца за незалежнасьць нейкага іншага народу, ці змогуць яны абараніць незалежнасьць сваю?**

**А.Л.:** Я лічу, што здольныя. Як гісторык вайсковай справы, магу сказаць, што быў такі момант, напрыклад, 1920 г., калі беларуская дзяржава зьнікла толькі таму, што беларусы прайгралі вайну з бальшавіцкай Расеяй. А гэта ня сорам, бо Расея — вялікая краіна, ёй можна прайграць вайну. Але гэты прыклад паказвае, што беларусы ўмеюць змагацца за сваю дзяржаву. А сёньняшняя сытуацыя няясная. Цяпер няма адкрытага прыгнёту Беларусі якой-небудзь краінай. Маем справу «хатнюю», унутраную.

**«НН»: А Вы ня думаеце вярнуцца ў палітыку?**

**А.Л.:** Безумоўна, калі будуць выбары на Беласточчыне, я ў іх уключуся, бо лічу гэта сваім грамадзкім абавязкам, хоць у нас будуць кандыдаты больш за мяне важкія. У гэтым пытаньні я зыходжу з пазыцыі арганізацыі. Выбары ў нас свабодныя, і ня ўзяць у іх удзелу — гэта здаваць адразу ўсе пазыцыі.

**«НН»: А ці доўга, на Вашу думку, Беларусі чакаць свабодных выбараў?**

**А.Л.:** Разважаючы пра беларускую сытуацыю, можна згадаць, як калісьці было ў Польшчы. Я памятаю, калі пад канец 70-х мы, студэнты, гаварылі, што ўжо такая стагнацыя ў краіне, такі маразм, што гэтага народу нішто ня зрушыць. Але выявілася, што народ усё ж выступіў і ўзьнікла «Салідарнасьць». А гэта было літаральна праз месяц пасьля маёй размовы зь сябрам, калі мы наракалі, што ніхто за намі ня пойдзе. А здарылася так, што мы мусілі даганяць пасьля... Я памятаю сытуацыю ў Беларусі ў 1990—91 г. Тады таксама здавалася, што нічога ня будзе. Прыгадваю размовы зь беларускімі дзеячамі, памятаю Сойм БНФ, на якім гаварылася, што «народ сьпіць і ніхто яго не падыме». А праз тыдзень пачаліся першыя страйкі і вулічныя дэманстрацыі. Таму я, як гісторык і чалавек з дваццацігадовым досьведам у палітыцы, магу сказаць: калі нам сытуацыя ў краіне падаецца тупіковай, гэта ня значыць, што так будзе праз месяц. Самыя вялікія падзеі, якія адбываліся на маіх вачах, адбываліся нечакана. Гэта мне дазваляе ўсё ж такі быць аптымістам і не складаць рук. Трэба працаваць і спадзявацца на лепшае.

**Гутарыў Сяргей Ёрш**

## ДАВЕДКА «НН»

**Алегу Латышонку** 46 гадоў. Ён — самы высокі беларускі палітык (203 см).

Дзяяч польскай «Салідарнасьці», у 1982 г. праседзеў восем месяцаў у турме за падпольную дзейнасьць. Былы лідэр Беларускага дэмакратычнага аб’яднаньня — адзінай партыі беларускай меншасьці ў Польшчы. Цяпер старшыня Беларускага гістарычнага таварыства, працуе на катэдры беларускай культуры ў Беластоцкім унівэрсытэце. Аўтар кнігі «Białoruskie formacje wojskowe 1917—1923» (Беласток, 1995) і суаўтар «Гісторыі Беларусі ад паловы XVIII да канца XX ст.» (разам зь Яўгенам Міრановічам, Беласток, 2002). Ягоны ўлюблёны герой зь беларускай гісторыі — легендарны Ўсяслаў Чарадзей.

## ШАПІК З ПРЭСАЙ

## На Сувальшчыне захоўваецца беларускасьць


11/03

Czasopis

W kościele, repliką którego jest ta świątynia, wybudowana w ostatnich latach w Białymstoku, ponad dwieście lat modlił się białoruski lud. Po białorusku głoszono tam kazania, spowiadano... (str. 34)

У лістападаўскім нумары «Czasopisu», што выходзіць у Беластоку, надрукаваны вялікі ліст студэнта родам зь Ліпску, што на Сувальшчыне. Хлопец распавядае, што толькі ва ўнівэрсытэце зразумеў, што гаворка, якая чуваць у яго на бацькаўшчыне... беларуская. Адбылося гэта, калі ён паступіў на славянскае мовазнаўства і трапіў на лекцыі да праф.Смулковай. На ягоную думку, насельнікі Сувальшчыны ня сьведамыя сваёй беларускасьці, бо праграма польскіх школаў ігнаруе беларускія дыялекты, а беларускія дзеячы Польшчы цікавяцца выключна праваслаўнымі, аўтаматычна запісваючы каталікоў у палякі. Таксама аўтар наракае на тое, што мала беларускай друкаванай прадукцыі выходзіць лацінкай. Ліст напісаны ў неблагой беларускай мове.

«Czasopis» можна чытаць праз Інтэрнэт (www.slonko.com.pl/czasopis).

# Лісты з Поўначы

Славамір Адамовіч

**Працяг. Пачатак у №42.**



**Славамір Адамовіч сярод просьбітаў «азюлю» (другі зьлева).**

Просьбітаў прытулку можна разасобіць на некалькі катэгорыяў.

Найперш гэта сапраўдныя бежанцы, якія ўцякаюць ад войнаў у сваіх краінах, разьні паводле нацыянальных, расавых ці рэлігійных прыкметаў (аўганцы, курды, афрыканцы, чачэны).

Другую групу складаюць грамадзяне, якія едуць у Эўропу на заробкі, але замест работы атрымліваюць зялёную кніжку бежанца, г.зн. уваходзяць у Сыстэму (трапляюць *на азюль*). Гэта пераважна прадстаўнікі «братніх» рэспублік былога СССР. Амаль усе яны з часам пачынаюць красьці, падвышаючы такім чынам памер свайго сацыялу — памесячнай выплаты на ежу і прадметы першай неабходнасьці (адзеньне, пасьцельная бялізна і посуд выдаюцца кожнаму новаму бежанцу).

Трэцяя катэгорыя — *бамбісты*, якія едуць у Заходнюю Эўропу пераважна *брыгадамі* з канкрэтнай мэтай: *бамбіць (выстаўляць)*, альбо, кажучы чалавечай мовай, папросту абкрадаць без разбору крамкі, крамы, супэр- і гіпэрмаркеты *сытых капіталістаў*. Бамбісты таксама ўваходзяць у Сыстэму, што дазваляе ім знаходзіцца ў краінах Эўразьвязу ды яшчэ атрымліваць сацыял на кішэнныя выдаткі.

Чацьвертая катэгорыя — студэнты і авантурысты-качэўнікі. Ім сыстэма прыёму бежанцаў дазваляе вандраваць з канца ў канец Эўропы, адкладаючы эўра на плэй-стэйшн.

Бальшыня азюлянтаў, зь якімі мне прыйшлося сутыкнуцца, лае краіну свайго знаходжаньня. Да народу, які дае ім часовы, а ў пэрспэктыве, магчыма, і пастаянны прытулак, выказваюць пачуцьцё непрыязнасьці, а то й адкрытай агрэсіі, і былыя савецкія, і чарнаскурыя, і арабы. Здаецца, толькі цыганы да праблемы дружбы народаў адносяцца памяркоўна (відаць, спрацоўвае той факт, што іх радзіма там, дзе ім даюць жыць).

У Нарвэгіі найбольшыя шанцы на атрыманьне прытулку маюць аўганцы, чарнаскурыя, курды й палестынцы. Грамадзяне з былога СССР разглядаюцца як бежанцы катэгорыі grunn lųs — неабгрунтаваныя (эканамічныя) бежанцы. Выключэньне складаюць чачэнцы і ў пэўнай ступені беларусы. Увогуле цяпер сярод былых савецкіх стала модным здавацца *пад беларусаў* (варта толькі зайсьці на сайты беларускай апазыцыі, пазнаёміцца з апошнімі заявамі прэзыдэнта Л., і можна выпраўляцца на інтэрвію). На жаль, пакуль што для ўцекачоў зь Беларусі не ўвялі моўнага тэсту, як тое зроблена адносна чачэнцаў.

Нельга не згадаць пра *тэматыку*, альбо *букет прычынаў*, на падставе якіх здаюцца на азюль.

Для беларусаў галоўная палітычная тэма — Лукашэнка, які зьяўляецца рэальнай пагрозай для жыцьця й здароўя беларускіх грамадзянаў, нязгодных зь яго рэжымам.

Акрамя *паліт*прытулку можна спадзявацца й на *гуманітарны*. Напрыклад, калі вы зможаце даказаць, што на радзіме вас перасьледавалі як верніка расейскай праваслаўнай царквы, мармона, пяцідзясятніка ці прадстаўніка сэксмяншыні.

Асаблівай папулярнасьцю сярод азюлянтаў у нашым лягеры карыстаецца *тэма псыхічнага здароўя*. Маўляў, вальтанутыя маюць вялікія шанцы на атрыманьне пазытыву. Вось чаму з дамкоў, дзе кантуюцца бежанцы «трэцяга сьвету», пэрыядычна чуюцца проста нечалавечыя рыканьні, енк і гвалт. Маладзы самаліец Сала (гэта імя ў яго такое) любіць, да прыкладу, крычаць ноччу *камон*, а паўдням, калі ў канторы зьбіраецца лягернае начальства, сядае на газон і пачынае штосьці шукаць у траве...

Нейкая цывілізацыйная наіўнасьць, якую я называю атупеньнем ад дабрабыту і стратай інстынкту самазахаваньня, апаноўвае ладную частку эўрапейскага грамадзтва, і ў прыватнасьці скандынаваў. Распавядаюць, што нейкі нарвэскі вучоны заявіў: генафонд нарвэжцаў могуць палепшыць... чарнаскурыя. А невядомы мне нямецкі прафэсар вынайшаў, што наша цывілізацыя бярэ пачатак з... Афрыкі. Чуткі гэтыя гуляюць па Сыстэме не без падставаў: старой рыма-каталіцкай і пратэстанцкай Эўропе ўсё яшчэ думаецца, што яна можа спаборнічаць з плавільным катлом амэрыканскага кантынэнту. Аднак, здаецца, сытуацыя выглядае крыху інакш, і калі ў часы Карла Маркса па Эўропе блукаў прывід камунізму, то цяпер па ёй вольна разгульвае цэлая кампанія: эмісары «Аль-Каіды», «Талібану», культу Вуду і Шаміля Басаева...

Паабцёршы зь дзясятак азюлянцкіх нараў, успомніў я, чарнабровачка, першае сваё знаёмства з прадстаўнікамі Каўказу, што прыпала на часы маёй службы ў савецкім войску: мы, «духі», стаім на пляцы в/ч 40790 прыбалтыйскага гарадка Пілаў, а перад намі скуластая фізіяномія навабранца Ях'яева. Якога сяржанты-славяне расьпякаюць за нежаданьне выконваць нарад на прыбіраньне казармы. Шабры гэты нашчадак лермантаўскіх чаркесаў так і ня ўзяў у рукі, за што яго некалькі тыдняў «дзяды» прасавалі нагамі й салдацкімі дзягамі — аж пакуль аднойчы на ўваходзе ў сталоўку зьняважаны «дух» не пырнуў аднаго з сваіх крыўдзіцеляў нажом.

> У часы Карла Маркса па Эўропе блукаў прывід камунізму. Цяпер па ёй вольна разгульвае цэлая кампанія: эмісары «Аль-Каіды», «Талібану», культу Вуду і Шаміля Басаева.

Тады паводзіны навабранцы Ях'яева і абуралі, і выклікалі нейкую таемную павагу (не па сваёй жа добрай волі пайшоў ён у тое войска, а забралі яго пад пагрозаю турмы, ды яшчэ загадалі падлогу мыць, чаго ён ніколі дома не рабіў, вось і супраціўляецца).

Прайшло больш за дваццаць гадоў з таго часу. І ў далёкай халоднай Нарвэгіі, у лягеры для бежанцаў, я зноў спатыкаю каўкаскіх ворагаў швабры, сыноў таго савецкага Ях'яева. Тут іх ніхто не прымушае падмятаць, не дае нарадаў па-за чаргой. Наадварот, даюць прытулак, выплачваюць грошы на жыцьцё... Але ж не, жывучы ў адным блёку з прадстаўнікамі без малога двух дзясяткаў нацыянальнасьцяў, маладыя горныя «арлы» ўсяляк ухіляюцца ад прыбіраньня. Больш за тое, яны абураюцца, калі, беручы зь іх прыклад, перастаюць прыбіраць і іншыя. Вось чаму, мая любка, я думаю, што ёсьць, ёсьць нешта ў фразе «мочить в сортире», якую сказануў нейк прэзыдэнт адной несымпатычнай мне дзяржавы.

Я ўжо згадваў, што бальшыня бежанцаў, мною бачаных, выяўляюць папросту нейкую бальшавіцкую варожасьць да мясцовага насельніцтва. У лютым гэтага году, напрыклад, чарнаскуры на вачох у пасажыраў зарэзаў кіроўцу аўтобуса, а ў чэрвені двое палестынцаў забілі старэнькую нарвэжку. Пасьля такіх здарэньняў на TV і ў прэсе зьяўляюцца гуманісты-псыхолягі, якія пачынаюць тлумачыць паводзіны забойцаў *цяжкім дзяцінствам абвінавачваных*.

Праблема масавага напліву ў Заходнюю Эўропу сапраўдных і фальшывых бежанцаў — любімы канёк праварадыкальных партый, якія маюць нямала сваіх яўных і кухонных прыхільнікаў.

Зь невялікімі скарачэньнямі падаю тут наступны яскравы дакумэнт эпохі паходу на «Тытанік».

«Усім жыхарам бежанскіх лягераў Нарвэгіі.

Мы вельмі ўзрушаныя тым, што два бежанцы зь лягеру ў Хагесуне абвінавачваюцца ў забойстве адной бездапаможнай 83-гадовай нарвэжкі. Забойства зьдзейсьнена з асаблівай жорсткасьцю. Яно пазбавіла нас бясьпекі, прымусіла жахнуцца, пасяліла ў людзях страх.

Абодва вінаватыя ў забойстве зьяўляюцца просьбітамі прытулку і жылі ў лягеры Хагалан. Усе задаюць пытаньне: як людзі, якія самі прыехалі ў Нарвэгію ў пошуках міру і бясьпекі, маглі зьдзейсьніць такі дзікі ўчынак. Іншыя задаюцца пытаньнем, як мы можам дапамагаць тым, хто просіць нашай дапамогі, але пры гэтым дазваляе сабе такія барбарскія паводзіны.

Гэтае жорсткае здарэньне падштурхнула да распальваньня нянавісьці і паказала ўцекачоў у Нарвэгіі з дрэннага боку. Гэта адно з многіх сур'ёзных здарэньняў, якія адбыліся ў розных лягерах за апошні час, што прымушае мясцовае насельніцтва ставіцца да бежанцаў зь вялікім недаверам. Мы чуем і чытаем у газэтах пра бежанцаў, замяшаных у панажоўшчыне, крадзяжах і вандалізьме. І таму нам важна нагадаць вам пра вашу адказнасьць за свае паводзіны...

Вы ўсе павінны ўсьведамляць адказнасьць за тое, што да вас пачалі нэгатыўна ставіцца. Ніхто не запрашаў вас у Нарвэгію працяць прытулку. Кожны прыехаў з уласнай ініцыятывы.

Вы самі зрабілі выбар, просячы прытулку і спрабуючы знайсьці лепшую будучыню ва ўмовах бясьпекі і дэмакратыі. Таму важна кожнаму з вас узяць адказнасьць за ваш выбар і за яго наступствы. Мы ведаем, што жыцьцё ў лягеры нялёгкае, што камусьці добра, а камусьці і дрэнна; ведаем, што многія зьбеглі ад праблем і складаных сытуацый, таму для нас нечакана, што ўцекачы ад праблем самі ствараюць праблемы і непрыемнасьці іншым.

Кожны з вас павінен быць паслом сваёй краіны, сваёй культуры і вартых традыцый. Неабходна паважаць краіну, у якой вы просіце прытулку, і мясцовае насельніцтва, якое прымае вас. Давесьці, што зьяўляецеся патрэбнымі Нарвэгіі людзьмі, зь ведамі і кампэтэнцыяй».

**Працяг будзе.**





ARCHE

**ВІЛЕНСКАЯ АНТАЛЁГІЯ**

«Вільня. Анталёгія беларускай паэзіі XX ст.», укладзеная Сяргеем Дубаўцом. Аляксандар Батура «Расея перад выбарам». Чэслаў Мілаш, Мікола Нікалаеў, Даніла Жукоўскі, Віталь Зайка «Быцьцё і нябыт Вільні», Андрэй Катлярчук, Андрэй Казакевіч «Літва, якой мы ня ведаем».
Пытайцеся ў кнігарнях і шапіках «Белсаюздруку», а таксама ў незалежных распаўсюднікаў.



REUTERS

## Туякрад

**52-гадовы жыхар Берасьця** падазраецца ў крадзяжы дрэваў. Як цьвердзіць міліцыя, ён выкапаў і прадаў 21 тую, пасаджаную на вуліцы Крупскай, на якой жыве старшыня аблвыканкаму Даўгалёў. Абвінавачваны ўжо прызнаўся, што прадаў дрэўцы на базары за 3—5 тысяч рублёў. У афіцыйных паведамленьнях падкрэсьліваецца, што зладзей — адстаўны палкоўнік расейскага войска.

Штангіст **Генадзь Аляшчук** здабыў на чэмпіянаце сьвету ў Ванкувэры бронзавы мэдаль (падняў агулам 317,5 кг). З радасьці Генадзь зрабіў на памосьце сальта. Найлепшы, відаць, гімнаст сярод штангістаў.

## Уладзімер Канаплёў

**Віцэ-сьпікер палаты прадстаўнікоў** лічыць, што ўдзел афіцыйнай беларускай дэлегацыі ў працы Парлямэнцкай асамблеі Рады Эўропы немэтазгодны. Маўляў, няхай спачатку ПАРЭ «аздаравіцца». Гэта можна лічыць рэакцыяй афіцыйнага Менску на актыўнасьць камісіі Кавалёва-Пургурыдэса, што расьсьледуе зьнікненьні Захаранкі й Ганчара.

**Леанід Кучма** апынуўся на апэрацыйным стале з дыягназам «вострая тонкакішкавая непраходнасьць на фоне спаечнай хваробы брушыны». Адразу пасьля апэрацыі ён падпісаў загад аб прызначэньні новага генпракурора. Папярэдні, на думку апазыцыі, не дагадзіў тым, што занадта актыўна шукаў забойцаў Гангадзэ.

**Міхаіл Трапашкін,** расейскі адвакат, а раней — супрацоўнік ФСБ, правёў уласнае расьсьледаваньне выбухаў 1999 г. у Маскве. На ягоную думку, арганізавалі іх не чачэнцы, а расейскія спэцслужбы. На наступны дзень пасьля таго, як Трапашкін даў інтэрвію «Московским новостям», у якім ён расказаў пра вынікі свайго расьсьледаваньня, яго арыштавалі нібыта за незаконнае захоўваньне зброі.

**Салім Салех**, брат прэзыдэнта Ўганды, трапіў пад суд за хабар. У 1997 г. ён атрымаў 800 тыс. даляраў за спрыяньне ў справе набыцьця двух патрыманых беларускіх шрубалётаў. Машыны выявіліся поўным мэталаломам, Уганда страціла 7 млн даляраў.

У Амэрыцы працягваецца наступ лібэральных каштоўнасьцяў. Дэмакратка **Кэтлін Бланка** стала першай кабетай, абранай на губэрнатарскую пасаду ў штаце Луізіяна. Яе супернікам быў прадстаўнік індыйскае меншасьці. А ўсяго гадоў дзесяць таму на выбарах у Луізіяне ледзь не перамог правадыр ку-клукс-клану Дэвід Д'юк. Тым часам суд **штату Масачусэтс** зьняў забарону на гомасэксуальныя шлюбы.

**Невядомы расеец**, які жыве ў Лёндане, — уладальнік найбольшага ў сьвеце ружовага дыямэнту вагою ў 70,39 карата і коштам 100 млн даляраў. Багатыр дазволіў прадэманстраваць камень памерам як сьлўка на выставе ў Маскве, але назвацца адмовіўся. Паводле чутак, гэта Барыс Беразоўскі, які нядаўна атрымаў від на жыхарства ў Вялікай Брытаніі. А цяпер дражніцца.

**Джон Ален Мугамад**, снайпэр, што год таму трымаў у страху ўвесь Вашынгтон, прызнаны вінаватым у забойствах. Прысудам будзе, найхутчэй, сьмяротная кара. 41-гадовы Мугамад — прафэсійны вайсковец, удзельнік «Буры ў пустыні». Чалавек вайны з скалечанай псыхікай. Рэмаркаўскі сюжэт.

## Чалавек, які стварыў Гітлера

**Эдмунд Фостэр** стварыў Гітлера. У 1918 г. гэты прафэсар-мэдык лячыў гіпнозам унтэр-афіцэра Шыкльгрубэра, які ўдумаў, што пасьля газавай атакі страціў зрок (хоць вочы пашкоджаныя не былі). Прафэсар разьвіў у маладога Гітлера комплекс абранасьці: маўляў, намаганьне волі — і ты будзеш бачыць. Зрок вярнуўся, але і комплекс застаўся. У 1933-м гестапа ліквідавала Фостэра. Пра гэта піша ў кнізе «Чалавек, які стварыў Гітлера» гісторык Дэвід Льюіс.

## Вольга Сацюк

з Кобрыні заняла чацьвертае месца на дзіцячым конкурсе «Эўрабачаньне-2003». На першых трох пазыцыях — прадстаўнікі Харватыі, Гішпаніі й Вялікай Брытаніі. Пры галасаваньні ў заходнеэўрапейскіх краінах перамагалі гішпанцы і брытанцы, а беларусам і харватам самыя высокія адзнакі выставілі латыішы, палякі, македонцы. Усяго ўдзел бралі падлеткі з 16 краінаў.

**СМ**

## Новыя лімэрыкі

### Андрэй ХАДАНОВІЧ

Працавіты мужык з-пад Вушачаў,
як пчала, для калгасу ішачыў:
за гектарам гектар
браў у кветак нэктар.
Нават «сотавік» меў — люд аддзячыў.

Закаханы галкіпэр зь Дзярэчына
не прызначыў дзяўчыне сустрэчы на
стадыёне ля броўкі,
бо раўнуюць сяброўкі —
штангаў пара й адна папярэчына.

Самураю-будысту з-пад Клецку
сапсавалі любімае нэцке —
знакам ДАСТу й крыжом...
Для кансэрваў нажом
харакіры зрабіў па-савецку.

Завіталі ў музэй у Кушляны
тры Каляны й чатыры Таляны:
стрэсьці ў экскурсаводкі
*бурачковае* водкі —
для таварышаў зь Яснай Паляны.

Казанова й вандроўнік з Лынтупаў
паўзямлі пехатою пратупаў.
Бачыў шмат каралеў,
ды ні разу ня млеў
ад прыгожых, як наскія, дупаў.

**• ДЗЕ ВАРТА БЫЦЬ •**

## Цень Ван Гога

**З 12 лістапада ў менскім Палацы мастацтваў адчынілася міжнародная выстава, прысьвечаная 150-годзьдзю з дня нараджэньня Ван Гога.** Міжнароднае грамадзкае аб'яднаньне мастакоў і мастацтвазнаўцаў «Майстар» сабрала пад адным дахам палотны, створаныя ў Беларусі, Польшчы, Літве, Расеі, ЗША, Італіі, Францыі, Чэхіі, Баўгарыі. Іх яднае рознай ступені падабенства да стылістыкі знакамітага мастака. Максымальная цана квіткоў для наведнікаў — 1200 руб. Вучням, студэнтам, пэнсіянэрам скідкі. Удзельнікі вайны і інваліды праходзяць бясплатна. Выстава будзе працаваць да канца тыдня. Не рэкамэндуецца наведваць выставу зь дзецьмі.

**Арцём Лява**


ФРАГМЭНТ КАРЦІНЫ І.БАСАВА «ТЛУМАЧЭНЬНЕ»

**ТАКІНДАНГ**


**Аляксандар Лукашэнка: «Утрымліваць алькаголікаў коштам працоўных ня будзем!.. Каб у выцьвярэзьнік ім болей трапляць не захацелася!»**


**Арнольд Шварцэнэгер: «Welcome to the hotel California».**

**• ПРЫВАТНЫЯ АБВЕСТКІ •**

**ЗАПРАШАЕМ на падарожжа 30 лістапада** (нядзеля) «Сьвянцянскі край» па маршруце: Менск — Смургоні — Вішнева — Сьвір — Засьвір — Шэметава — Камарова — Лынтупы —Камаі — Менск.
Т.: 232-54-58, 622-57-20 (Зьміцер)
Т.: 264-12-38, 776-24-35 (Павал)

**ВІТАНЬНІ**

**Віншую** Галіну і Вітольда Ўрбановічаў з маім нараджэньнем. Ваш сынок — нарэшце!

**Зьміцер і Таня**, віншую вас з днём народзінаў. Зычу шчасьця, здароўя. Брат Саша

**Вельмішаноўную** гаспадарыню Настасьсю Аршанскую (то бок мілую Таську) віншую з 19-годзьдзем! Серж Гамялецкі

**Тасю**, не пакідай сьлядоў на засьнежаных дахах аэрапортаў. Будзь пільнай — можа напасьць шчасьце. З народзінамі! І_Серж

**26 лістапада** вып'ем, Тасю, ліманаду. З народзінамі, коцечка. Серж

**ЛЕКАРЫ**

**Беларускія лекары** для Вас і Вашых дзетак. http://medicus.iatp.by

**КАЦЯНЯТЫ**

**Двое кацянятаў** (прыгожыя, выхаваныя, з пасагам) вельмі хочуць знайсьці сабе добрага, надзейнага гаспадара. Т.: 251-38-75

**КАНТАКТЫ**

**Не абы-якая** дзяўчына 25 гадоў пазнаёміцца з прыстойным і адукаваным маладым чалавекам. А/с 114, 220088, Менск

**УДАКЛАДНЕНЬНЕ**

У №41 на старонцы 15 праз тэхнічны збой быў надрукаваны верш Рыгора Барадуліна «Беларускаму Ліцэю» зь няслушна пазначаным аўтарствам.

**ПАШТОВАЯ СКРЫНКА**

**Sieržuku K. Ź Miensku.** Ci varta pierachodzić na łacinku tolki dziela taho, «kab rasiejcy nie śmiajalisia»? Dastatkova prosta lubić svajo i nie kampleksavać.

**Юр'ю Я. зь Бярозаўкі.** Дзякуй вялікі за здымак. Пры нагодзе выкарыстаем.

**Зосі Т. зь Менску.** У «Пагоні за зубной шчоткай», як для газэты, задужа нематываванага.

**Міхасю А. зь Менску.** Нарыс «Эвалюцыя прадпрыемства» не газэтны. Гэта амаль навуковая публікацыя.

**Ігару М. зь Менску.** Вашу зацемку «Ці правільны я патрыёт» аддайце ў «Народную волю», бо гэта водгульле папярэдняе публікацыі з «НВ».

Наша Ніва КУПОН БЯСПЛАТНАЙ ПРЫВАТНАЙ АБВЕСТКІ

Запоўніце гэты купон, і мы надрукуем Вашу абвестку (ня больш за 15 словаў) бясплатна. А/с 537, 220050, Менск.

Тэкст ______

Імя і прозьвішча ______

Адрас, тэлефон ______

**Наша Ніва**
незалежная газэта
заснаваная ў 1906, аднοўленая ў 1991
**галоўныя рэдактары «Нашай Нівы»:**
З.Вольскі (1906), А.Уласаў (1906—1914), Янка Купала (1914—1915), А.Луцкевіч, У.Знамяроўскі (1920), С.Дубавец (1991—2000).

| | |
|---|---|
| сакратарка рэдакцыі | Наста Бакшанская |
| галоўны рэдактар | Андрэй Дынько |
| выпускны рэдактар | Арцём Лява |
| карэктар | Сяргей Петрыкевіч |
| карэктарка | Галіна Рабянкова |
| нам. галоўнага рэдактара | Андрэй Скурко |
| тэхнічны рэдактар | Андрэй Чык |
| выдавец і заснавальнік | Фонд выданьня газэты «Наша Ніва» |

**АДРАС ДЛЯ ДОПІСАЎ:**
**220050, Менск, а/с 537**
**Tel/fax: (017) 284-73-29, 8-029-613-32-32.**
**E-mail: nn@promedia.by**
**On-line: www.nn.by**
© **НАША НІВА**. Спасылка на «Нашу Ніву» абавязковая.
8 палос фарматам А2, 4 друк. арк. Друкарня РУП «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». Менск, пр. Скарыны, 79. Рэдакцыя не нясе адказнасьці за зьмест рэклямных абвестак. Кошт свабодны. Пасьведчаньне аб рэгістрацыі пэрыядычнага выданьня № 581 ад 4 ліпеня 2002 г., выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусі. Юрыдычны адрас: г. Менск, вул. Калектарная, 20а, п. 2а. Р/р 3015212000012 у МГД ААТ «Белінвестбанк», Менск код 764.
Наклад 3408. Газэта выдаецца 48 разоў на год.
Нумар падпісаны ў друк 22.00 19.11.2003.
Замова № 6189.
Рэдакцыйны адрас: Менск, Калектарная, 20а/2а